№№61–62
(2581–2582)

19 красавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

Той выпадак, калі можна сказаць: мінус не толькі для рэдакцыі, але і для ўлады.

Пра канферэнцыю, якую наладзіў для кіраўнікоў беларускіх друкаваных і электронных СМІ А.Р.Лукашэнка, "Народная воля" магла б расказаць яшчэ напрыканцы мінулага тыдня. Але абставіны, звязаныя з друкаваннем газеты ў Смаленску і распаўсюджваннем уласнымі сіламі, на жаль, не дазволілі зрабіць гэта аператыўна.

Удзел у прэс-канферэнцыі ўзяў і галоўны рэдактар газеты "Народная воля" Іосіф Сярэдзіч. Адказы на яго пытанні друкуюцца без скарачэнняў. Адначасова знаёмім чытачоў з іншымі фрагментамі прэс-канферэнцыі.

Александр ЛУКАШЕНКО:

«...А как президент, пожалуйста, вот я публично говорю — я не запрещаю той типографии вас печатать. Я не запрещаю...»

Іосіф СЯРЭДЗІЧ, галоўны рэдактар газеты "Народная воля": — Аляксандр Рыгоравіч, перад такой вялікай колькасцю мікрафонаў і тэлекамер мае галасавыя звязкі не дазваляюць трымацца ў ролі Цыцырона, але...

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Так у Вас микрофон есть, ближе наклонитесь и будет нормально...

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Ён не выручае... І ўсё ж дазвольце задаць нават не адно пытанне.

Першае. Я і мае калегі — рэдактары шэрагу недзяржаўных газет звярталіся да Вас двойчы з адной і той жа просьбай. Менавіта яе я выказваю Вам і сёння. Дапамажыце, Аляксандр Рыгоравіч, "Народнай волі" і іншым недзяржаўным газетам вярнуцца ў беларускія друкарні, у кіёскі "Саюздруку", у тыя ж каталогі "Белпошты". Толькі, калі ласка, вось зараз, калі будзеце адказваць, я прашу: не спасылайцеся на тое, што па нашых законах гаспадарчыя суб'екты маюць права заключаць з намі дагаворы ці не заключаць. І не ківайце ў бок Русакевіча *(міністра інфармацыі. — Рэд.),* **у нас з ім асаблівыя адносіны. Нам адкрыта кажуць, што гэтая праблема залежыць толькі ад аднаго чалавека — менавіта ад Вас. Вось у гэтым кантэксце і адкажыце...**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Можно я сразу отвечу, не кивая. Вы меня призываете, чтобы я Вам ответил на этот вопрос не как политик, а просто по-человечески, нормальным языком. Я вам отвечаю по-человечески. Найдите еще в мире такого дурня, на которого в этих негосударственных, как Вы говорите, средствах массовой информации, на его семью и его детей грязь такую несут, что даже "Московскому комсомольцу" и не снилось! И Вы ко мне обращаетесь и просите: "Аляксандр Рыгоравіч, вярніце нас у друкарні, у свае там каталогі". Я Вам по-человечески задаю риторический вопрос: как бы Вы на моем месте поступили?

Но я стараюсь эмоции спрятать, потому что я должен поступить как президент. А как президент, пожалуйста, вот я публично говорю — я не запрещаю той типографии вас печатать. Я не запрещаю. Но если, печатая вас, типография нарушит наш закон, белорусский, они за это ответят. И вот при этом условии они никогда не заключат с вами договор. Потому что то, что вы пишете, они по закону напечатать не могут!

Слушайте, ну как можно, недавно читаю, простите меня, это прямой эфир, но уже озвучу, помогу вам. Пишут, что Лукашенко несколько дней нет на экранах телевидения, в средствах массовой информации, потому что он в запое. Слушайте, какой человек в Беларуси может поверить, что их президент... Извините, мне даже стыдно порой бывает, что я не могу выпить нормально, как мужик, встречаясь с другими президентами, и так далее. Его упрекнули, что он в запое! Зачем вы это пишете? Вы что, когда-нибудь меня пьяным видели? А посмотрите, как вы истязаете детей. Что, мои дети этого заслужили? Мои дети что, хуже ваших детей оппозиционеров? Они же здесь учились, здесь получали образование, на Ваших глазах как люди, особенно вы, вы мою семью знаете, когда мои детки еще вот такими сыновья были, Иосиф Павлович! Зачем же Вы так себя ведете...

Я несколько примеров привел. А журналисты наши более внимательно читают ваши газеты, и они знают, как вы себя ведете. И вы ко мне обращаетесь как к человеку: Александр Григорьевич, не кивайте на тех лиц, от Вас все зависит, разрешите нам еще в более широком объеме писать неправду и нести эту безглуздицу!

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Мне здаецца, Аляксандр Рыгоравіч, Вы не маеце маральнага права нас у гэтым плане папракаць...

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Я ж в данном случае не Вас только упрекаю, Вы же выступили от имени всех редакторов. Вы от всех задали вопрос. А погосударственному — идите и заключайте с ними *(типографиями, "Белсоюзпечатью" и "Белпочтой"* — **Ред.)** договор.

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Русакевіч, чулі? *(звяртаецца да У.Русакевіча, міністра інфармацыі. — Рэд.)*

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Да, чуў Русакевіч. Но если только будет нарушена хоть одна статья закона, ответите и Вы, и Русакевич.

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Згода! Ёсць закон і Канстытуцыя. Русакевіч, чулі? *(Зноў звяртаецца да міністра інфармацыі. — Рэд.)* **Я за гэта сто гадоў выступаў, Русакевіч, скажыце!**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Ну дальше давайте вопросы. А то что-то мы в митинг превращаем это...

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Ну тады я потым, няхай іншыя пакуль задаюць...

Аляксандр ЛУКАШЭНКА *(звяртаецца да вядучага прэс-канферэнцыі)*: — Тогда Иосиф Павлович еще один вопрос пусть задаст, обязательно слово ему предоставьте. А то опять напишет, что дали ему задать один вопрос, а второй — не дали.

Праз некаторы час, адказваючы на пытанне дырэктара інфармацыйнага агенцтва "БелаПАН" А.Ліпая пра закрытасць інфармацыйнай прасторы, Лукашэнка раптам прамовіў: "От этой кампании никаких секретов быть не должно, от наших журналистов, государственных, частных, пусть даже они не государственные, стоящие в оппозиции к власти. Как бы там ни было они власти не навредят. Навредят. Все равно Середич напишет то, что он думает. Запретим, не запретим, меньше, больше, но напишет. Ну зачем с ним бороться? Ну пусть пишет. Но распространять, конечно, мы ему газеты не будем... А пишет или... пускай свободно это распространяет и продает. Нету чего бояться этого..."

Вядома, такія развагі прэзідэнта вымусілі галоўнага рэдактара "Народнай волі" яшчэ раз вярнуцца да высвятлення пазіцыі А.Р.Лукашэнкі наконт вяртання некаторых недзяржаўных выданняў у беларускія друкарні, кіёскі "Белсаюздруку" і каталогі "Белпошты".

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Давайце расставім кропкі над "і". Напачатку Вы сказалі, што не супраць, каб "Народная воля" вярнулася ў беларускія друкарні.

Вы не супраць таго, каб "Народная воля" вярнулася ў кіёскі.

Вы не супраць таго, каб "Народная воля" вярнулася ў падпісныя каталогі "Белпошты".

І, як мне здалося, нават паглядзелі на міністра і далі яму пэўнае даручэнне. Зараз, літаральна тры хвіліны таму, з Вашых вуснаў прагучала, што "я не буду распраўсюджваць "Народную волю". Ну калі гэта фігуральна было сказана...

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Фигурально, фигурально...

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Я тады здымаю пытанне і лічу, што мы расставілі кропкі над "і".

Праўда, калі можна, яшчэ адну кропку пастаўце, і мне здаецца, што мы гэтым самым здымем нават праблему Вашых апанентаў, якіх дастаткова і сярод нашых чытачоў. У народзе даўно пульсіруюць чуткі, што Вы рыхтуеце сабе пераемніка — старэйшага сына. Скажыце, гэтыя чуткі маюць пад сабой нейкую глебу? Ці наогул ніякай падставы для гэтага няма? Мы пра гэта напішам, і кропка будзе пастаўлена.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Напишите, Иосиф Павлович, что в ближайшем обозримом будущем президентом Беларуси будет Александр Лукашенко. Я Вам клянусь судьбами моих же детей, о которых Вы говорите, что мы никогда эту проблему дома не обсуждали. Если бы даже я подумал обсуждать, то я все равно Виктора... Вы же о Викторе говорите, то он слабее сегодня и завтра еще будет слабее ныне действующего президента. Так зачем же слабейшего поддерживать и выдвигать?

Ну а если уже говорить о преемнике, то самого маленького буду готовить в преемники. Уникальный человек! Поэтому подождите. Может, мы не дождемся, но другие поколения белорусов дождутся. Вот я Вам сказал абсолютно честно.

Іосіф СЯРЭДЗІЧ: — Мы ўсё слова ў слова надрукуем.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: — Да. Поэтому я Вам сказал абсолютно честно, честно, как на духу. Ну Вы же прекрасно понимаете, кто создает эти слухи...

— Вось таму і трэба заўсёды расстаўляць кропкі над "і".

— Ну хорошо, я буду стараться регулярно. Вы чаще приходите с вопросами. Прежде чем напечатать — спросите...

О ЧЕМ ЕЩЕ ГОВОРИЛ А.ЛУКАШЕНКО...

«Но главного виноватого надо искать...»

— Во многих-многих основных своих выступлениях, а одно из основных — это послание белорусскому народу и парламенту, я говорил о том, что наша внешняя политика многовекторная. Кто скажет, что я об этом не говорил, не говорю 13 лет подряд? Многовекторная внешняя политика: как на восток, так и на запад, на север и на юг. Это наш основной тезис.

Во-вторых, я всегда говорил, что мы прежде всего должны устанавливать самые тесные дружеские отношения с соседями, потому что соседей не выбирают. Они от Господа Бога.

И третье, поскольку мы практически один народ. По крайней мере, от одного корня растем — украинцы, белорусы, россияне. Российская Федерация — наш союзник, мощная ядерная держава, которая предоставила нам гарантии безопасности, когда мы отдавали ей ядерное оружие. Там наши интересы.

Что сегодня изменилось? Ничего. Я признавал и признаю сегодня то, что нам не удалось равномерно развивать внешнеэкономическую деятельность. Нам не удалось с Западом наладить такие отношения, которые у нас складываются сейчас с Российской Федерацией и Украиной, нашими соседями, и с государствами юга, как их сейчас в мире называют. Но если вы меня упрекнете в том, что я тому виной, я с вами не соглашусь. Конечно, не может быть так, чтобы мы совсем не были виноваты в не очень хороших отношениях с Западом. Наверное, и наша вина в этом есть. Но главного виноватого нужно искать не здесь, не в Минске. И вы хорошо знаете, что хочет от нас Запад.

...Это актуальная проблема, она не сходит с полос газет, с телеэкранов, из радиоэфира. Пишут, что после конфликта с Российской Федерацией мы начали активный диалог с Западом. Ничего подобного. Уважаемые друзья! Мы еще до этого конфликта постоянно сигнализировали Западу, что хотим установить нормальные отношения, и Запад обратной связью отвечал нам тем же. Я точно не помню, по-моему, 35 процентов товарооборота у нас сегодня с Россией, а с Евросоюзом — 45, на 10 процентов больше. Там у нас огромные интересы. Это платежеспособный рынок. Туда стремятся все, в том числе и Российская Федерация, продавать свой товар. Нас экономика, люди толкают к тому, чтобы мы имели нормальные отношения с Западом. Я это честно и откровенно говорю.

Но я всегда говорил, что мы не потерпим понуканий, не потерпим, когда Евросоюз благодаря своей "инерции" предлагает нам список мер, который ему напишет заранее так называемая белорусская оппозиция. Вот посмотрите этот список мер и прочитайте оппозиционную прессу. Эти меры там родились. Ну разве это нормальная основа диалога? Ненормальная.

Ну ладно бы пускай с подачи оппозиции действовал Запад, но главное, чтобы это было цивилизованно. Ну что от нас сегодня требовать? День воли прошел вроде неплохо. Ну так вы посмотрите, что их собственные каналы транслируют из Франции и других стран. Вы посмотрите, что там происходит. Сколько там задерживают! Мы же если и задерживаем кого-то — провокаторов, отрабатывающих деньги. Я не хочу допустить того, чтобы на улицах Минска какие-то разгильдяи, 400 боевиков, а вместе с сочувствующими 1,5 тысячи, извините меня, гадили на улицах и мешали людям жить. Этого не будет. Потому что спрос прежде всего с президента. Есть, в конце концов, закон. Его надо выполнять. И мы об этом говорим Европе. Если вы хотите без двойных стандартов, на нормальных условиях, согласно нашему законодательству устанавливать с нами добрые отношения, пожалуйста, мы к этому готовы. Если у вас нет к этому интереса и вы решили нас чему-то поучать, то спасибо, мы здесь уже достаточно пожили и мы знаем, в каком направлении нам развиваться, пожалуйста, не лезьте и не мешайте нам, мы у вас ничего не просим, вы нам не мешайте. Или кто-то желает конфронтации?.. Думаю, что нет.

Европа не заинтересована в том, чтобы в центре, здесь, появилась какая-то "горячая точка". Для Европы это крайне невыгодно прежде всего с экономической точки зрения. Между Евросоюзом, с одной стороны, и Россией и другими республиками бывшего Союза идет огромный обмен товарами. И все это в основном через Беларусь. И то, что они заинтересованы в этом, показывают те огромные деньги, которые вкладывают в строительство пограничных переходов и пунктов пропуска на нашей границе, чтобы не задерживать этот поток товаров. Мы, конечно, будем в этом плане хорошими партнерами для Европейского Союза.

Поэтому мы будем с нашими соседями развивать добрые, человеческие, партнерские отношения. Иначе мы себя и вести не можем. Зачем нам позиционироваться в мире по-другому? Зачем нам быть каким-то нестабильным, непрогнозируемым, непонятным государством и неперспективным партнером для наших ближайших соседей, да и вообще для всех государств? Мы выиграем только от того, если мы, занимая свое место в мире, будем стабильными, предсказуемыми, хорошими партнерами. В этом направлении мы будем действовать.

«...Но независимость и суверенитет ценнее. Ни на что мы их не променяем — ни на газ, ни на нефть»

— Когда я только стал президентом, вы ж рядом тогда были, когда я стал президентом, все были опьянены независимостью и суверенитетом. Я еще тогда предупреждал, что это очень дорого стоит. То, что Россия резко подняла нам цены на газ и нефть, — подтверждение тех моих слов. Нам прямо сказали: либо входите в качестве региона в состав России, либо мы поставим вас в равные условия по углеводородам в один ряд с другими странами, такими как Германия. Но независимость и суверенитет ценнее. Ни на что мы их не променяем — ни на газ, ни на нефть. Но вы не думайте, что у нас с российским руководством не идет диалог — он очень активный. Ни с моей стороны, ни со стороны Владимира Владимировича Путина нет никакой неприязни.

«Переход на валюту другого государства — это потеря почти всей независимости и суверенитета»

— ...Потом нам начали подкидывать не приемлемые для нас вопросы. Переход на валюту другого государства — это потеря почти всей независимости и суверенитета. Сначала надо принять Конституционный акт. Начинать строить дом надо с фундамента, а не с крыши, как предлагает нам Россия, иначе ему не на чем будет держаться. В Российской Федерации одумались, как они говорят, и решили упорядочить наши отношения, в том числе и по нормативной базе. Начался выход из "невыгодных" соглашений. Так что не наша вина, что затормозился интеграционный процесс.

«Повальной приватизации не будет...»

— Политика рыночного реформирования в стране незыблема. Что касается приватизации, то здесь мы давно определились: повальной приватизации не будет, только точечная, тех предприятий, которые мы не можем потянуть сами.

Сегодня нам поступает немало предложений. Например, о продаже за 500 миллионов долларов пакета акций оператора сотовой связи "БеСТ" или за 300—500 миллионов акций Velcom. Над этими предложениями стоит подумать, поскольку они супервыгодны. Но когда мне говорят: продайте 25 плюс одну акцию "Беларуськалия", а предлагают гораздо больше, чем "Газпром" нам предложил за пятьдесят процентов "Белтрансгаза", я отвечаю: нет.

Самое главное, что мы будем делать для поднятия экономики, — это создавать везде конкурентную среду.

Что касается энергетики. Оппозиция кричит: "Нам не нужна атомная электростанция, давайте проведем референдум!" Но мы и так со всех сторон окружены АЭС. Мы будем поступать так, как поступают во всем мире. А современная тенденция такова, что Евросоюз и тот после конфликтов с Россией по газу и нефти вплотную занялся атомной энергетикой.

«...Я не царь, я пахарь на своей должности»

— Я абсолютно честно говорю: я не вижу своей судьбы в российской политике в том контексте, как это пишут. Во-первых, нет нормативной базы в Российской Федерации для этого. Во-вторых, поймите вы, наконец, что я имею ту же должность в Беларуси. Для меня это обычная рутинная работа, как для Якубовича быть главным редактором. Ему уже настолько надоело идти за этот стол каждый день, да и у него, может, больше разнообразия, чем у меня... Я не царь. Я пахарь на своей должности.

АБЗАЦАМ

Мінск—Дэлі

Прэзідэнты Індыі і Беларусі прынялі сумесную дэкларацыю, у якой вызначылі перспектывы і накірункі ўзаемадзеяння. Пацверджана гатоўнасць актывізаваць беларуска-індыйскае супрацоўніцтва.

15 тысяч дрэў

Каля 15 тысяч дрэў пасадзяць вясной у Мінску. Асноўная маса — у гарадскіх зонах адпачынку.

Закаханы ў космас

У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава работ сталічнага скульптара Івана Міско. Усе работы звязаны з касманаўтыкай, якой ён прысвяціў жыццё.

У Венесуэлу

Мінскі трактарны завод заключыў першы кантракт на пастаўку 15 трактароў у Венесуэлу.

10-гадовых аўтобусаў амаль у тры разы больш, чым новых

Па выніках 2006 года аўтатранспартнымі прадпрыемствамі, якія падпарадкоўваюцца "Мінтрансу", набыта 1125 аўтобусаў, што складае 16,34% ад агульнай колькасці эксплуатуемых сёння пасажырскіх машын (7794 у краіне). Большая частка новых аўтобусаў была выраблена на беларускіх прадпрыемствах. Але ў краіне ўсё яшчэ застаюцца 3106 аўтобусаў, якія былі выпушчаны больш за дзесяць гадоў таму.

У 25 краін

Беларускае абястлушчанае малако, казеін, ільноваланно, коні карыстаюцца попытам у многіх, а дакладна, у 25 краінах свету, такіх, як Германія, Японія, Францыя, Італія... А "Гомельхлебпрам" збіраецца пастаўляць хлеб аж у Таронта, што ў Канадзе.

«Дзень Беларусі» ў Гановеры на кірмашы

У нямецкім горадзе Ганновер праходзіць знакаміты прамысловы кірмаш. У ім бяруць удзел 33 прадпрыемствы Беларусі.

Нэлі Уварава тры дні правяла ў Мінску

Выканаўца галоўнай ролі ў папулярным серыяле "Не нарадзіся прыгожай" прыехала ў Мінск не адна, а са сваімі калегамі — артыстамі Расійскага акадэмічнага маладзёжнага тэатра.

Адзін з самых лепшых тэатраў Масквы на гастролі ў Мінск запрасіў кіраўнік тэатральнага праекта "Віртуозы сцэны" **Уладзімір Ушакоў.**

Паводле слоў артыстаў, больш за ўсё ў сталіцы Беларусі іх уразіла добрая дарога ад аэрапорта да гатэля.

"Гэта было наша самае першае прыемнае ўражанне", — прызналіся артысты.

Народная Воля http://www.nv-online.info
19 КРАСАВІКА 2007 г.

СКАНДАЛ

Дело пограничников

*Увольнение со службы председателя Государственного комитета погранвойск страны **Александра ПАВЛОВСКОГО** некоторые связывают с делом сморгонских пограничников. Два года на белорусско-литовской границе при участии должностных лиц пункта пропуска "Котловка" был открыт канал для переправки контрабандного товара без надлежащего оформления.*

Нам удалось узнать подробности этого беспрецедентного дела.

27 мая Военная коллегия Верховного суда Беларуси поставила точку в деле пограничников, которое тянулось несколько лет. В ходе судебного разбирательства были озвучены суммы денег, которых из-за преступной деятельности белорусских пограничников и таможенников не досчиталось государство, и часть которых осела в карманах участников данной группировки. Цифры казались нереальными, настолько были высокими. Преступники имели миллионы долларов чистой прибыли. Поражал и состав преступной группы. По делу проходило 42 пограничника, 5 таможенников и только два гражданских лица. Осуждены полковник, два майора, капитан запаса и более десяти прапорщиков. Правда, решением суда все они лишены воинских званий.

...Это дело раскручивалось с 2002 года сразу несколькими силовыми ведомствами Беларуси. Оперативным сотрудникам УВКР КГБ стало известно о фактах переправки через пограничный пункт "Котловка" "черных" фур — машин с контрабандным грузом, которые не регистрировались на границе. Груз — дорогостоящая бытовая техника, автозапчасти, сантехника, одежда и даже продукты питания, естественно, не облагался таможенными платежами. В основном контрабандный товар переправлялся в Москву. После того как была поставлена точка в уголовном разбирательстве в Беларуси, пять томов дела белорусские оперативники передали в российскую столицу. Местные следователи задержали еще одного фигуранта этого дела — криминального авторитета по кличке Голландец, который контролировал деятельность преступной группировки в России. В скором времени Голландец тоже предстанет перед судом.

Но вернемся к белорусским фигурантам скандального дела. Оперативникам удалось установить, что схему, как можно легко заработать сотни тысяч долларов, и при этом практически ничего не делать, разработал житель поселка Островец Павел Кусойть. По документам — индивидуальный предприниматель. Именно Кусойть предложил начальнику 15-го погранотряда погранвойск Беларуси полковнику Михаилу Солодухе посодействовать в переправке через границу фур с товаром, следующих из Литвы. Естественно, за особое вознаграждение. Солодуха в свою очередь отдавал своим подчиненным указания пропускать через границу без досмотра и минуя компьютерную регистрацию тот или иной транспорт. Так в преступную группировку были вовлечены начальник ОПК "Котловка" Сергей Лутчина, его заместитель Игорь Бельский, начальники смен и рядовые пограничники и таможенники. В ходе следствия было установлено, что в разные периоды времени с мая 2002-го по июнь 2004 года "гонорар" пограничникам за каждую пропущенную машину составлял до 1300 долларов. Хотя, по некоторым данным, это цифра как минимум в 5 раз выше. Точно установлено, что за этот период белорусскую границу пересекло 623 фуры с контрабандным товаром. В ходе следствия удалось точно установить, что только за год — с октября 2002-го по октябрь 2003 года должностными лицами Ошмянской таможни и Сморгонского пограничного отряда были получены взятки на общую сумму 786.700 долларов США. Но опять-таки оперативники не исключают, что эта сумма могла быть и выше.

Роли среди участников преступной группировки были распределены четко. Кусойть отвечал за груз и прохождение его через таможню. Солодуха координировал действия пограничников. Доказано, что иногда фуры с контрабандным товаром передвигались по территории Беларуси в сопровождении машин ГАИ.

На протяжении двух лет механизм не давал сбоя. Всех устраивали и гонорары за непыльную работу.

Павел Кусойть построил в поселке Островец шикарный трехэтажный коттедж, который явно не вписывался в местный ландшафт. Он ездил на БМВ последней марки, а жене подарил роскошный новенький "Мерседес". Кусойть владел всей информацией в городе, ему докладывали не только о том, что происходит на белорусско-литовской границе, но и обо всем, чем живет Островец. Свои люди сигнализировали Кусойтя о том, что его деятельностью заинтересовалась Военная прокуратура, что в Островец стали приезжать сотрудники КБГ из Минска. Но уверенный в своей безнаказанности и, видимо, в покровительстве сверху, он продолжал переправлять через границу контрабандный товар.

Кусойтя задерживали сотрудники УВКР КГБ. Во время обыска в одной из комнат его роскошного коттеджа были найдены копии документов по уголовному делу, которое вела Военная прокуратура! Следователи просто взялись за головы, когда узнали об этом. Кто "сливал" информацию Кусойтю, установить не удалось.

Во время обыска в доме Кусойтя было изъято 45 тысяч долларов. Деньги натурально валялись под ногами, хозяева не знали им счета. Валюту оперативники находили в ящиках стола, в шкафах, в барсетке хозяина, целлофановый мешок с деньгами обнаружили в бардачке автомобиля Кусойтя.

Шикарную жизнь вел и полковник Михаил Солодуха. Хотя таких апартаментов, как его подельник Кусойть, не имел. Солодуха позволял себе иные, менее привлекающие внимание окружающих удовольствия. Например, ежедневно он ездил на работу в Сморгонь из Минска. 125 км туда, 125 — обратно. Но никто не интересовался, как живет семья Солодухи, если практически вся его зарплата уходит на бензин. Один из оперативников, задерживающий Солодуху, был поражен... обувью полковника. "Такие туфли потянут долларов на 500, не менее", — не сдерживал он своих эмоций.

Рассказывают, с каким размахом 22 июня 2003 года в Сморгони полковник Солодуха отмечал свое 40-летие. В его честь в нескольких километрах от литовской границы прогремел такой салют, что местные жители по-настоящему испугались, не началась ли новая мировая война...

О вседозволенности полковника ходили легенды. Хотя, как установит следствие, это были самые что ни на есть реальные истории. Однажды Михаил Солодуха в нетрезвом состоянии управлял своим автомобилем и превысил скорость. Дежуривший на трассе инспектор ГАИ жезлом потребовал остановиться. Но Солодуха не только не выполнил требование инспектора, но и попытался скрыться. На огромной скорости он помчался в Сморгонь, в воинскую часть, на территорию которой преследовавшую его машину ГАИ подчиненные Солодухи не пропустили. Автоинспекторы зафиксировали номер автомобиля и установили, кто был за рулем в тот день. Однако наказание за это нарушение понес не Солодуха, а... двое сотрудников ГАИ. Их просто уволили с работы.

...Суд по сморгонскому делу длился почти год, следствие шло еще дольше. Павла Кусойтя задержали 12 июня 2004 года, Михаила Солодуху — 1 сентября 2004 года. Но даже за решеткой Павел Кусойть имел привилегии. Он содержался в так называемой коммерческой камере, в которой был холодильник, телевизор, из ресторана ему привозили обеды и ужины.

Приговор Белорусский военный суд вынес 14 ноября 2006 года. Большинство пограничников и Павел Кусойть получили длительные сроки лишения свободы. Михаил Солодуха осужден на 14 лет лишения свободы с отбыванием срока в колонии усиленного режима. По 12 лет получили начальник пункта пропуска Сергей Лутчина и его заместитель Игорь Бельский. Павел Кусойть осужден на 10 лет лишения свободы. Все с конфискацией всего имущества. Но практически никто из фигурантов дела не имел особняков и дорогих машин, все имущество они оформляли на родственников. Михаил Солодуха, например, был прописан в общежитии войсковой части г.Сморгонь, а шикарный особняк Павла Кусойтя — собственность его тестя.

Говорят, что в ходе следствия якобы было установлено, что о деятельности преступной группы знал и председатель Государственного комитета погранвойск страны Александр Павловский. Якобы за молчание ему хорошо платили. Но в ходе суда эти факты не только не подтвердились, о них даже не упомянули...

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.
Фото photo.bymedia.net

ВМЕСТО КОММЕНТАРИЯ

Почему в Беларуси так бессовестно воруют пограничники и таможенники? Сморгонское дело не первое, когда за решеткой за тяжкие преступления оказались люди, присягавшие на верность Родине.

Валерий ФАДЕЕВ,
заслуженный юрист Беларуси, заместитель председателя Конституционного суда Беларуси в отставке:

— Мне приходилось бывать в Сморгонском районе, и местные жители показывали дома, построенные якобы таможенниками и пограничниками, задавая при этом риторический вопрос: "Откуда у них деньги на такие особняки?"

Я думаю, причин того, почему воруют люди в погонах, несколько. Можно говорить о психологических причинах, когда человеком движет жажда быстро разбогатеть. Я заметил, что в условиях, когда мы, с одной стороны, провозгласили некоторые рыночные ценности, но с другой — не создали условия для их реализации, человек ищет иные пути, как много заработать. И идет на нарушения законов.

Возможно, людей толкает на преступления маленькая зарплата, неуверенность в завтрашнем дне. Они думают, что сегодня уворуют, спрячут награбленное, и их детям не надо будет волноваться за будущее.

Но в Сморгони была создана преступная группировка. Наверное, это стало возможным прежде всего потому, что в стране несовершенна законодательная база. И это дает возможность искать и находить некие лазейки для контрабанды. На мой взгляд, власть в нашей стране недостаточно подконтрольна обществу. Можно, конечно, спорить, должны ли пограничники и таможенники находиться под общественным контролем. Но, на мой взгляд, должны...

Сергей САЦУК,
руководитель творческой мастерской Агентства журналистских расследований БАЖ:

— Я знаком с делом сморгонских пограничников, разговаривал с родственниками осужденных. И хотел бы отметить два момента.

И в Сморгони, и в Островце очень сложно найти работу. Практически все жены осужденных пограничников нигде не работали. Официальные зарплаты мужей были невысокие. И когда у них появилась возможность подзаработать, они согласились. Хотя, в принципе, у них не было выбора. Указания пропускать через границу без досмотра и регистрации отдельные машины поступали сверху. Тех, кто отказывался, увольняли. Те, кто не перечил начальству, имели дополнительный заработок.

И второй момент. Рядовые пограничники видели, как живут их начальники. Они понимали, что руководство погранотряда не могло так откровенно обманывать государство без ведома более высоких начальников.

Какой выход? Наверное, надо платить пограничникам и таможенникам такую заработную плату, чтобы не было соблазна воровать. И второе — главное — не воровать высшим чинам Беларуси, чтобы не подавать плохой пример подчиненным.

Адвакат Казуліна не зможа наведваць свайго падабароннага ў калоніі?

Ігар Рынкевіч напісаў заяву ў Мінскую абласную калегію адвакатаў аб звальненні па асабістым жаданні.

Юрыст заявіў, што вымушаны выйсці з адвакатуры. У Рынкевіча ўжо ёсць два дысцыплінарныя спагнанні, і ён не выключае, што цяпер будзе рыхтавацца яшчэ адно. А па беларускіх законах, адваката, які мае на працягу аднаго каляндарнага года тры спагнанні, могуць пазбавіць ліцэнзіі. Трэба меркаваць, што абаронца экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна вырашыў апярэдзіць падзеі.

Рынкевіч кажа, што паведаміў пра сваё рашэнне на апошняй канферэнцыі Мінскай абласной калегіі адвакатаў, дзе даволі жорстка пакрытыкаваў працэс рэгулявання дзейнасці адвакатаў у Беларусі. На той канферэнцыі Рынкевіч заявіў: *"Нас зрабілі бяспраўнымі. У нас вельмі многа праблем, а мы як карпарацыя не настойваем на сваіх інтарэсах. Да прыкладу, на мяне чыняць ціск, і я не збіраюся быць "хлопчыкам для збіцця". Як толькі выканаю даручэнні з кліентамі, у тым ліку з Аляксандрам Казуліным, я згодны па сваім уласным жаданні сысці з адвакатуры.... Я падаў адмысловую заяву, бо пачаўся ціск на адвакатаў маіх кансультацый, Мін'юст правярае сем чалавек. Ідзе ціск".*

Паводле слоў Ігара Рынкевіча, Аляксандр Казулін з разуменнем аднёсся да гэтага рашэння. *"Нягледзячы на перамену майго статусу, пытанне абароны інтарэсаў А.Казуліна будзе вырашацца мной у іншых эфектыўных формах"*, — кажа І.Рынкевіч, але пакуль устрымліваецца ад больш падрабязнага тлумачэння.

Не выключана, што заява Рынкевіча будзе разгледжана Мінскай абласной калегіяй адвакатаў ужо на гэтым тыдні.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

СВАБОДА СЛОВА

Аляксандр Зімоўскі адмовіў Аляксандру Мілінкевічу ў прадастаўленні прамога тэлеэфіру

Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі Аляксандр Зімоўскі адмовіў экс-кандыдату ў прэзідэнты Аляксандру Мілінкевічу ў прадастаўленні прамога эфіру Першага тэлеканала.

Старшыня Палітычнай рады Аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі Аляксандр Мілінкевіч у звароце да А.Зімоўскага ад 5 красавіка 2007 года прасіў прадаставіць яму магчымасць у прамым тэлеэфіры *"даць незалежную ацэнку дзейнасці дзяржаўных органаў па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай аварыі"*. А.Мілінкевіч меў намер запрасіць да ўдзелу ў гэтай перадачы таксама *"прадстаўнікоў экспертаў і ліквідатараў наступстваў трагедыі на ЧАЭС"*.

У адказе на гэты зварот старшыня Белтэлерадыёкампаніі ўсумніўся ў кампетэнтнасці А.Мілінкевіча і ягоных экспертаў і палічыў гэта *"дастатковымі падставамі адхіліць зварот". "Ведаючы Вас як пераканага і паслядоўнага прыхільніка заходняга пункту гледжання на падзеі, якія адбываюцца ў нашай краіне*, — гаворыцца ў лісце А.Зімоўскага, — *мяркую, што Вы таксама падзяляеце і погляды Захаду на праблемы гуманітарнай і іншай дапамогі Беларусі, якая накіроўваецца на пераадоленне наступстваў Чарнобыля. У сувязі з гэтым рэкамендую Вам як вялікаму вчонаму азнаёміцца з навуковай працай, што прыкладаецца да дадзенага ліста, пасля чаго, спадзяюся, Вы цалкам зразумееце, якія грубыя факталагічныя і навуковыя памылкі ўтрымліваюцца ў Вашым звароце"*.

Да ліста А.Зімоўскага прыкладзены высновы, зробленыя па выніках даследаванняў, апублікаваных 3 красавіка 2007 года ў онлайн-выданні "BioMedCentral Public Health". У гэтай публікацыі, у прыватнасці, адзначана: *"Уздзеянне радыяцыі на насельніцтва, якое найбольш пацярпела ад выбуху на Чарнобыльскай АЭС (ліквідатары аварыі і людзі, што працягваюць жыць у забруджаных рэгіёнах), прыводзіць да не большай сярэдняй дадатковай рызыкі смяротнасці, чым павышаны натуральны радыяцыйны фон дома ці на працы. ... Людзі, якія ўсё яшчэ жывуць неафіцыйна на пакінутых тэрыторыях вакол Чарнобыля, могуць фактычна мець больш нізкую рызыку захворвання ад радыяцыі, чым яны мелі б, калі б аказаліся пад уздзеяннем наступстваў забруджанага паветра ў такім буйным горадзе, як Кіеў"*.

Алесь КНЯЗЮК,
БелаПАН.

ДАСЛОЎНА

Элеанора КАПІТОНАВА: «Рост анказахворванняў апераджальны»

"Сярод ліквідатараў, эвакуіраванага насельніцтва і тых, хто працягвае жыць на тэрыторыі з узроўнем забруджвання вышэйшым за 15 кюры, адзначаецца статыстычна даставерны рост захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, галаўнога мозгу, анкалагічных праблем і, як ні дзіўна, хвароб органаў зроку, у прыватнасці, катаракт", — заявіла ў адным з інтэрв'ю **Элеанора Капітонава**, доктар медыцынскіх навук, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека. *"Падобныя тэндэнцыі характэрныя сёння не толькі для Беларусі, але і для Расіі і Украіны*, — сказала яна. — *Анкалагічныя захворванні ў цэлым па Беларусі растуць таксама, як і ў іншых краінах Еўропы. Што датычыцца пацярпелага насельніцтва, дык у гэтай групе рост анказахворванняў апераджальны, што і дазваляе навукоўцам звязваць захворванні з радыяцыйным фактарам"*.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Маці Крысціны ШАЦІКАВАЙ: «Дактары, якія ўтрымлівалі ў псіхушцы дачку, пакуль тлумачэнняў не далі»

Гэтая гісторыя нарабіла шмат шуму. Напярэдадні Дня Волі супрацоўнікі магілёўскага КДБ даставілі са сталіцы ў абласны цэнтр маладзёжную актывістку Крысціну Шацікаву. Па словах самой Крысціны, пасля допыту ў КДБ невядомыя ў цывільным сілай заштурхнулі яе ў аўтамабіль і адвезлі ў Магілёўскую псіхіятрычную бальніцу. Там Шацікава прабыла тры дні. Яе адпусцілі пасля Дня Волі — 26 сакавіка. У гэты дзень у псіхіятрычнай клініцы, дзе ўтрымлівалі Шацікаву, прайшоў кансіліум, які зацвердзіў, што псіхічнае здароўе маладзёжнай актывісткі ў норме. Ніякіх дакументаў аб тым, што Шацікава знаходзілася ў псіхіятрычнай бальніцы, ёй на рукі не далі. Роўна як і не паведамілі "дыягназ", які быў ёй пастаўлены.

Адразу пасля выхаду на волю Крысціна звярнулася ў пракуратуру з заявай, дзе падрабязна распавяла аб тым, што з ёй здарылася. Маці Крысціны Святлана Міхайлаўна кажа, што "Крысціну выклікаюць у пракуратуру для больш падрабязных тлумачэнняў па яе заяве", аднак зараз маладзёжная актывістка знаходзіцца ў Маскве, дзе праходзіць незалежную экспертызу наконт стану свайго псіхічнага здароўя. Зразумела, што ў выпадку, калі расійскія дактары прызнаюць Шацікаву псіхічна здаровай *(кансіліум магілёўскіх дактароў да такой высновы ўсё ж такі прыйшоў. —* **Аўт.***)*, у Крысціны будзе яшчэ адна "жалезная" падстава для таго, каб абскардзіць дзеянні магілёўскіх дактароў.

Тым часам маці Шацікавай была выклікана ў пракуратуру Ленінскага раёна горада Магілёва для дачы тлумачэнняў: *"Следчы Дзмітрычэнка*, — расказвае Святлана Міхайлаўна, — *якому даручана расследаванне па маёй заяве, цікавіўся фактамі, якія выкладзены ў маім звароце. Я расказала яму, што тры дні не ведала, дзе знаходзіцца дачка. Я таксама паведаміла і тое, што некаторы час дактары не прызнаваліся, што Крысціна знаходзіцца ў псіхіятрычнай клініцы. Следчы паабяцаў ва ўсім разабрацца. Цікава і тое, што, па яго словах, урачы, якіх таксама выклікалі ў пракуратуру, пакуль для дачы тлумачэнняў не прыходзілі. Хаця следчы запэўніў, што, згодна з законам, іх могуць даставіць прымусова. А яшчэ днямі я атрымала ліст з Магілёўскай абласной пракуратуры, дзе напісана, што разгляд справы перададзены следчаму Дзмітрычэнку. У гэтай жа паперы напісана, што прадмет разгляду — законнасць ці незаконнасць дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі і КДБ. Хаця я яшчэ раз падкрэсліваю, што ў заяве я скардзілася і на дзеянні дактароў, якія прымусова ўтрымлівалі маю дачку ў псіхушцы. У любым выпадку гаварыць аб нейкім працягу ў гэтай справе можна будзе толькі тады, калі ў пракуратуру сходзіць Крысціна. А здарыцца гэта толькі пасля 25 красавіка, калі дачка вернецца з Масквы"*.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ПРЫСУД

Каму адрасаваліся 7 мільёнаў долараў?

Днямі суд Цэнтральнага раёна Мінска паставіў прамежкавую кропку ў крымінальнай справе па дачы найбуйнейшага ў гісторыі Беларусі хабару ў памеры 7 мільёнаў долараў ЗША. Пяцёра абвінавачаных асуджаныя да зняволення ад 6 да 9,5 года. Аднак няма адказу на галоўнае пытанне: для каго прызначаўся хабар, які асуджаныя нібыта вымагалі ў расійскага бізнесмена?

Яшчэ ў сакавіку 2006 года сілавыя структуры атрымалі аператыўную інфармацыю пра тое, што прадстаўнікі шэрагу мінскіх прадпрыемстваў вымагалі ў дырэктара адной з расійскіх будаўнічых структур 7 мільёнаў долараў ЗША. Гэты астранамічны па памерах хабар нібыта прызначаўся для наступнай перадачы кіраўніцтву Мінскага райвыканкама і Мінскага аблвыканкама за станоўчае вырашэнне зямельнага пытання: каб улады выдзелілі 20 гектараў зямлі ў вёсцы Копішча Мінскага раёна забудоўшчыку — пад індывідуальнае будаўніцтва. У час перадачы першага "траншу" хабару памерам 1,5 мільёна долараў падазроныя былі затрыманыя.

Судовы разгляд справы ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска пачаўся 1 лютага 2007 года. Працэс па дачы найбуйнейшага хабару ў гісторыі суверэннай Беларусі завяршыўся ў вельмі сціслы тэрмін — 14 красавіка ўжо абнародаваны прысуд.

Усе пяцёра прызнаныя вінаватымі ў падбухторванні да дачы хабару ў буйным памеры, замаху на махлярства, які здзейснены арганізаванай групай у асабліва буйным памеры, незаконным завалодванні маёмасцю, незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці.

Алег Жукоўскі асуджаны да 9,5 года зняволення з канфіскацыяй маёмасці і з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму; Віктар Бароўнік атрымаў 9 гадоў зняволення з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму; Мікалай Пенкрат — 8 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці і з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму; Аляксандр Пашук асуджаны да 6,5 года зняволення з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму, ён жа пазбаўлены права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю тэрмінам на 4 гады, таксама суд пастанавіў спагнаць з яго 49 мільёнаў 450 тысяч беларускіх рублёў, атрыманых у выніку "незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці"; Юрый Міхайлоўскі асуджаны на шэсць гадоў зняволення.

Цягам 10 дзён прысуд можа быць абскаржаны ў вышэйшай судовай інстанцыі.

Прысуд абнародаваны. Віна пяцярых чыноўнікаў даказаная і "кара зямная" спасцігла вінаватых. Аднак ні следства, ні суд так і не далі адказу на галоўнае пытанне: для каго канкрэтна прызначаўся хабар у 7 мільёнаў долараў? Ці Феміда проста не захацела ўслых называць прозвішчы высокапастаўленых чыноўнікаў "далей ад граху"?

Генрых СТАХОЎСКІ.

ЧУЛІ?

Віцебскія крамы з'явіліся ў Маскве

Ад Масквы да самых да ўскраін — так можна вызначыць маштабы віцебскай гандлёвай экспансіі ў Расію. Адразу тры віцебскія крамы пачалі працаваць нядаўна ў расійскай сталіцы. Гэта — "Беларускія прадукты", "Віцебскія каўбасы" і прамтаварны магазін ГАА СП "Віт-Эл".

Паводле інфармацыі Камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама, гэтымі трыма "кропкамі" камерцыйная дзейнасць прадпрыемстваў Віцебшчыны ў Маскве не абмяжоўваецца. Працягваецца будаўніцтва аптова-рознічнага цэнтра Віцебскай вобласці ў Паўночнай адміністрацыйнай акрузе расійскай сталіцы, абмяркоўваецца пытанне аб далейшым развіцці сеткі гандлёвых прадпрыемстваў у фірмовых крамах Віцебшчыны ў Маскве.

Дарэчы, віцебскімі таварамі гандлююць і ў рэгіёнах Расіі — Смаленску, Пскове, Самары, Санкт-Пецярбургу, Арэхава-Зуеве, у гарадах Электрасталь, Тосна, Новасакольнікі.

Толькі ў студзені 2007 года гандлёвы абарот Віцебшчыны з Расіяй склаў 118 мільёнаў долараў.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
19 КРАСАВІКА 2007 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Понесут ли уголовную ответственность те, кто избивал Козулина?

2 марта 2006 года около 9 часов утра кандидат в президенты Республики Беларусь А.Козулин прибыл во Дворец культуры и спорта железнодорожников (ДКСЖ) с целью зарегистрироваться в качестве участника Третьего Всебелорусского собрания. Однако А.Козулину не удалось этого сделать, поскольку он и его доверенные лица были подвергнуты насилию со стороны неизвестных лиц. В тот же день О.Волчеком, А.Козулиным, его женой и дочерью были поданы жалобы в прокуратуру Республики Беларусь о возбуждении уголовного дела в отношении неизвестных лиц.

25 апреля 2006 года старший следователь прокуратуры Московского района г.Минска Соловянчик Б.Б., рассмотрев жалобы, вынес постановление об отказе в возбуждении уголовного дела в отношении сотрудников СПБТ "Алмаз".

Спустя год, 6 апреля 2007 года, руководитель юридической службы А.Козулина Олег Волчек и Юлия Козулина подали жалобу на имя прокурора г.Минска Н.Н.Кулика с требованием об отмене данного постановления и возбуждении уголовного дела в отношении тех, кто избивал кандидата в Президенты Республики Беларусь А.Козулина.

— Почему только сейчас подана жалоба? — с таким вопросом обратилась я к Олегу Волчеку.

— Со стороны может показаться, что жалоба действительно подана поздно. Однако все это время нами велась работа по сбору доказательств по данному факту. Пару месяцев назад у нас появился видеоматериал, как задерживали А.Козулина во Дворце культуры и спорта железнодорожников. Мы подготовили об этом документальный фильм "На передовой правды", куда включили все доказательства насилия по отношению к А.Козулину. И теперь, когда надзорная жалоба по уголовному делу А.Козулина будет рассматриваться в Верховном суде, мы рассчитываем, что прокуроры все же выполнят свой профессиональный долг — накажут виновных в избиении кандидата в президенты.

— Выяснил ли следователь Б.Соловянчик главный вопрос — мог ли А.Козулин зарегистрироваться делегатом и участвовать в работе Всебелорусского собрания?

— Я считаю, что следователь так и не разобрался в ситуации, законно ли было требование заместителя главы Администрации Московского района г.Минска Н.М.Гордеюк не пропускать к столам регистрации кандидата в президенты А.Козулина.

Согласно ст.8 Закона РБ "О республиканских и местных собраниях", участниками республиканского собрания могут быть также представители политических партий, которые избраны высшим руководящим органом партии. В феврале 2006 года прошел съезд БСДП "Грамада", на котором были избраны пять членов партии для участия в Третьем Всебелорусском собрании, в их числе был и кандидат в президенты А.Козулин.

Еще 25 января 2006 года А.Козулин обратился в оргкомитет по проведению Всебелорусского собрания с просьбой дать ответ относительно квот, по которым избираются делегаты. По истечении месяца никто не ответил на письмо А.Козулина. Тогда кандидат в президенты решил обратиться в Минский городской организационный комитет по подготовке и проведению собрания. С этой целью он вместе с доверенными лицами и прибыл к 9 часам 2 марта 2006 года в ДКСЖ, где проходила регистрация участников от г.Минска.

В соответствии со стст. 4, 6 Закона "Об обращениях граждан" Козулин имел право письменно обратиться в этот организационный комитет и зарегистрировать решение партии о его участии на данном собрании. Таким образом, Н.М.Гордеюк в данной ситуации не должна была останавливать в фойе А.Козулина, а, наоборот, принять от него документы. Оргкомитет в свою очередь был обязан рассмотреть эти документы и дать письменный ответ, в котором указать, есть у Козулина полномочия участвовать в собрании или нет.

В материалах проверки находится справка, что Н.М.Гордеюк для дачи объяснений не явилась. Странно, что следователь не стал настаивать на ее вызове, не уточнил причину неявки и не принял никаких мер в отношении Гордеюк за уклонение от дачи свидетельских показаний.

Считаю, что Н.М.Гордеюк злоупотребила своими служебными полномочиями, не позволив А.Козулину подать в регистрационную комиссию решение партии, чем спровоцировала конфликт, в результате которого был избит Козулин и его доверенные лица.

— Сразу же после избиения А.Козулин заявил, что его задерживали сотрудники СПБТ "Алмаз", но, судя по фотоснимкам, невозможно понять, кто из них сотрудники милиции, а кто — нет. Встает вопрос, а были ли они вообще при исполнении служебных обязанностей?

— Считаю, что на тот момент ни руководитель "Алмаза" Карпенков, ни его заместители не находились при исполнении служебных обязанностей.

Во-первых, сотрудник милиции при исполнении служебных полномочий должен быть одет по форме и иметь беджик с указанием его должности и фамилии. Согласно ст.19 Закона Республики Беларусь "О милиции", сотрудники милиции применяют физическую силу, в том числе боевые приемы борьбы, подручные средства для предотвращения и пресечения правонарушений, самообороны, преодоления противодействия законным требованиям работников милиции, если ненасильственные способы не обеспечивают выполнения возложенных обязанностей. На фотографиях при захвате А.Козулина не запечатлено ни одного сотрудника милиции в форменной одежде.

Во-вторых, на просмотренной видеопленке не видно, чтобы А.Козулин нарушал общественный порядок. Также не видно, чтобы кто-либо из граждан в штатской одежде показывал Козулину документ, что он является сотрудником милиции.

Допустим, даже если Козулин и хулиганил, то в этой ситуации сотрудник милиции в соответствии со ст.18 Закона о милиции перед применением физической силы обязан был сначала его предупредить, а потом применять физическую силу.

На видео четко видно, что как только А.Козулин пошел к столам регистрации, одни бойцы молча сбивают его с ног, а другие — в штатском — начинают препятствовать журналистам снимать происходящее. Идет грубая силовая борьба, в которой участвуют неустановленные лица в штатском, а также руководитель "Алмаза" Н.Карпенков и заместитель начальника ГУВД Мингорисполкома А.Т.Найденко.

Из этого можно сделать следующий вывод. Все сотрудники милиции находились в здании как частные лица, а поэтому их действия надо рассматривать как хулиганские. Следователь не представил в материалах проверки приказа министра МВД о направлении для охраны общественного порядка группы "Алмаз". Также в материалах дела не было приказа начальника ГУВД Мингорисполкома о том, что А.Т.Найденко находился при исполнении служебных обязанностей, осуществляя охрану порядка в ДКСЖ. Все, что заявляют сотрудники милиции, голословно и ничем не подтверждается. Также неясно, какова была целесообразность обеспечения общественного правопорядка силами руководства спецподразделения по борьбе с терроризмом "Алмаз". Охрану таких мероприятий обеспечивают силы райотдела или сотрудники ОМОНа. Согласно Закону о милиции в функции СПБТ "Алмаз" не входят задачи по обеспечению общественного порядка.

— На представленных Вами фотографиях хорошо видно, как А.Козулина избивают, в то же время следователь пишет, что сотрудники милиции ничего не нарушили. Любопытно, что говорят сами алмазовцы по поводу своих действий?

— Могу привести пару цитат из материалов проверки.

Александр Дедков: *"...По радиостанции Карпенков дал команду задерживать Козулина и лиц, нарушающих общественный порядок... На полу лежал Козулин и рядом с ним происходила потасовка. Я подбежал к Козулину, оттеснил людей, стоящих рядом с ним, схватил его за одежду под мышки, развернул к себе лицом и начал вытеснять последнего в сторону выхода из ДКСЖ. В этот момент Козулин наносил мне удары руками по телу, а также неизвестные мне люди со стороны наносили удары по телу. Я вытеснял Козулина из ДКСЖ, при этом ударов по телу не наносил. Козулина я вытеснил, т.к. он нарушал общественный порядок..."*

Иван Белясников: *"...Сафин стал перед Козулиным, представился работником милиции, требовал успокоиться. На что Козулин сделал выпад двумя руками в сторону Сафина и нанес удар ногой К.Тюшевскому... Каким образом происходило задержание Козулина, я не видел, так как пытался удержать нахлынувшую толпу, постоянно громко говоря, что я работник милиции. Все работники "Алмаза" были в гражданке..."*

Борозинец О.С. *"...Я обежал колонну Козулина, раскинув руки в сторону, показывая, что здесь нет прохода, и кричал "Милиция". В это время я был сбит с ног, упал на пол, пытался вскочить. Мне на глаза была натянута шапка, и в это время я почувствовал удар в голову... Ударов по телу Козулина, корреспондентов и другим я не наносил, а только выставлял руки вперед. На фото изображено мое лицо. Вполне, когда я встал с пола, оказался на одном плане с Козулиным, но к нему я не подходил..."*

Из показаний О.Борозинца, И.Белясникова, А.Дедкова следует, что А.Козулин и его доверенные лица — генерал-лейтенант милиции, экс-председатель Верховного Совета 13-го созыва Мечислав Гриб, генерал-майор Вооруженных сил Дмитрий Фролов, бывший депутат Верховного Совета 13-го созыва юрист Павел Знавец, член Центризбиркома Иван Лобачев, заместитель руководителя предвыборного штаба Иван Анташкевич, руководитель юридической службы Олег Волчек и другие стали избивать сотрудников милиции, нарушая общественный порядок. В результате этих противоправных действий были причинены телесные повреждения А.Дедкову, О.Борозинцу и другим сотрудникам милиции. Согласно уголовно-процессуальному законодательству, если сотруднику милиции причинены побои, то прокурор обязан возбудить уголовное дело в отношении лиц, совершивших нападение на сотрудников милиции. Но, как видим, прокуратура не возбуждала уголовное дело по факту оказания сопротивления сотрудникам милиции в отношении А.Козулина и его доверенных лиц.

Не понятно, почему следователь не вызвал "пострадавших" И.Сафина, К.Тюшевского для дачи объяснений. Считаю, что к показаниям сотрудников спецподразделения "Алмаз" следует отнестись критически. Они не являются правдивыми, поскольку противоречат не только показаниям друг друга, но и другим доказательствам по делу.

— Были ли в период следствия допрошены свидетели со стороны Козулина?

— Были, но не все. Однако и этих свидетельских показаний хватило бы для того, чтобы наказать по закону сотрудников "Алмаза". Генерал В.Д.Фролов пояснил: *"...Возле нашей группы ходил Д.Павличенко. Я увидел, как Козулин, пройдя три шага, остановился, так как к нему подбежали три-четыре человека и схватили его за руки. Один мужчина в черной одежде пригнул спину Козулину, при этом последний был повален на пол. Мужчины, повалившие на пол Козулина, начали наносить ему удары ногами по телу... Спустя 10—15 секунд около 4—5 человек взяли Козулина за руки и ноги, начав выносить из здания... Я прошел три-четыре шага, почувствовал удар ногой в спину. От удара я упал на пол... Выйдя из здания ДКСЖ, ко мне подошел М.Гриб и сказал, что ногой в спину мне нанес Павличенко..."*

Журналист Д.Брушко пояснил: *"...Я услышал фразу Козулина "Я иду регистрироваться". Я стал выяснять, на каком основании меня выталкивают, и просил предъявить удостоверения. Меня отталкивали двое мужчин, но никаких документов не представляли и не разъясняли... Я вырвался из рук неизвестного мужчины и увидел, что 4—5 человек взяли за различные части тела А.Козулина, волокли его по полу по направлению к выходу из здания... Как Козулина вынесли, то неизвестные люди держали вход..."*

Эти показания согласуются с видеозаписью захвата Козулина. Все это происходило на глазах заместителя начальника ГУВД Мингорисполкома Найденко, который в действия неизвестных лиц не вмешивался. Из этого следует, что эта провокация была заранее спланирована спецслужбами. Еще раз обращаю внимание, что даже представители Мингорисполкома В.Г.Курбеко и Э.В.Томильчик не знали, кто эти люди в черной одежде.

— Была ли дана правовая оценка действиям Д.Павличенко и других лиц, которые издевались над А.Козулиным?

— В материалах дела имеется справка, что Д.Павличенко также не явился на допрос, как и Н.М.Гордеюк. В средствах массовой информации Д.Павличенко не отрицал, что ударил А.Козулина. Следовательно, в действиях Д.Павличенко содержатся признаки преступления, предусмотренного ч.2 ст.339 УК РБ, именуемые как хулиганство.

Также следователь не дал правовой оценки действиям заместителя начальника ГУВД Мингорисполкома А.Т.Найденко, который бездействовал и не принял мер по прекращению издевательств над кандидатом в президенты Республики Беларусь А.Козулиным.

— Так все же совершал или нет какие-то хулиганские действия А.Козулин?

— 6 марта 2006 года Прокуратура Республики Беларусь заявила: *"... Козулин А.В. оказал неповиновение и применил силу в отношении сотрудника милиции, после чего был задержан и доставлен для разбирательства в УВД администрации Октябрьского района г.Минска. По факту хулиганских действий в здании Дворца культуры и спорта железнодорожников в отношении Козулина А.В. составлен протокол об административном правонарушении, предусмотренном ст.15б КоАП Республики Беларусь (мелкое хулиганство)".*

Кроме того, на Третьем Всебелорусском собрании А.Лукашенко сказал, что А.Козулин избил женщин. Как позже выяснилось на суде по уголовному делу А.Козулина, данный эпизод сопротивления работникам милиции в ДКСЖ А.Козулину стороной обвинения не предъявлялся, т.е. прокуратура посчитала, что А.Козулин не совершал в ДКСЖ хулиганских действий ни в отношении сотрудников милиции, ни в отношении женщин.

Спрашивается: за какие противоправные действия командир СПБТ "Алмаз" Н.Карпенков дал команду задерживать А.Козулина?

— Откуда у Вас такая подробная информация о сотрудниках СПБТ "Алмаз"?

— Буквально вечером 2 марта 2006 года нам уже были известны фамилии всех нападавших. А.Козулина до этого не раз предупреждали, что в отношении него готовится провокация, но он шел к своей цели и никого не боялся. Не раз нам говорили, что за ним ведется оперативная слежка. Информацию об этой спецгруппе нам предоставлял кое-кто из действующих офицеров. Во многом нам помог бывший сотрудник "Алмаза" Игорь Макар. Он хотел выступить на суде в защиту А.Козулина, но судья Рыбаков не допустил его в качестве свидетеля. Тогда он распространил список своих бывших коллег, тех, кто принимал участие в избиении А.Козулина. Вот что он писал: *"...Анализируя действия подразделения 2 марта 2006 года, могу сказать, что это была запланированная работа. Такие сотрудники, как О.Борозинец, И.Белясников, А.Дедков, И.Сафин, А.Бугаенко, К.Тюшевский, В.Сорокин, в одной группе работать не могут. Эти люди находятся на различных должностях. Кроме того, среди тех сотрудников практически все имеют разряд мастера спорта РБ. Следовательно, если они работали в ДКЖ 2 марта, этих людей нужно было собрать заранее, поставить им задачи и спланировать мероприятие. Так почему Н.Карпенков так готовился к этому мероприятию? Думаю, будет правильно вызвать в суд министра МВД В. Наумова и спросить, кто, когда и зачем давал команду подразделению, у которого в уставе прописаны совершенно другие задачи... Я хочу рассказать о нашей последней встрече, на которой присутствовал Н.Карпенков и В.В.Наумов... У меня есть запись нашего разговора с В.В.Наумовым, который происходил в СПБТ "Алмаз". Там я понял, что А.В.Козулина при любых обстоятельствах задержали бы и подвергли суду..."*

Проанализировав представленные материалы и вещественные доказательства, можно прийти к однозначному выводу, что захват кандидата в президенты А.Козулина 2 марта 2006 года во время проведения агитационной кампании был заранее спланированной и организованной акцией, выполнить которую было поручено СПТБ "Алмаз".

Елена МИХАЛЕВИЧ.

А.В.Козулин представляет бумаги для регистрации на Собрание. Н.М.Гордеюк и Г.В.Курбеко не допускают его к столам регистрации.

О.С.Борозинец (мастер спорта по кикбоксингу) находится слева от А.В.Козулина в непосредственной близости к нему. По его лицу видно, что он в этот момент совершает какие-то тяжелые физические действия. А.В.Козулин утверждал, что кто-то из рядом стоящих душил его, обхватив шею галстуком. По покрасневшему лицу и голове А.В.Козулина видно, что он испытывает удушение.

А.Козулина повалили на пол. Вокруг А.Козулина находятся и удерживают его Д.Павличенко (в форме спиной), А.Бугаенко (кандидат в мастера спорта по рукопашному бою). Доверенное лицо А.Козулина И.Лобачев пытается пресечь незаконные действия неизвестных лиц, отталкивает от А.Козулина А.Бугаенко и О.Борозинца. Рядом с О.Борозинцом находится И.Сафин.

А.Козулина затолкали в микроавтобус. Руководил этими действиями Н.Карпенков.

Избитый А.Козулин после освобождения вечером 2 марта 2006 года.

Беларусам стане лягчэй працаваць у Польшчы

Міністэрства працы і сацыяльнай палітыкі Польшчы рыхтуе пастанову, якая павінна аблегчыць польскім фірмам працаўладкаванне замежных грамадзян. Як паведамляе "Польскае радыё", згодна з праектам, грамадзяне Украіны, Беларусі і Расіі змогуць працаваць у Польшчы без атрымання спецыяльных дазволаў на працягу трох месяцаў. Праўда, польскі працадаўца павінен будзе выдаць ім даведку аб працаўладкаванні. Плюс да таго па спрошчанай схеме "гастарбайтэры" павінны прыязджаць групамі і працаваць толькі ў канкрэтных галінах — будаўніцтве і сельскай гаспадарцы.

АФІЦЫЙНА

МУС тлумачыць...

Напярэдадні лета і водпускаў у дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі паступаюць шматлікія звароты грамадзян з просьбай растлумачыць парадак выезду ў краіны — удзельніцы СНД, у тым ліку ва Украіну і дзяржавы — члены Еўразійскага эканамічнага супольніцтва (Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан і Расія).

У сувязі з гэтым у МУС растлумачылі, што цяпер беларускія грамадзяне ва ўзросце ад 16 гадоў могуць выехаць ва Украіну па нацыянальным пашпарце ўзору 1996 года як з дазвольным запісам для часовых выездаў за мяжу, так і без яго. Асобы, якія не дасягнулі 16-гадовага ўзросту, пры перасячэнні беларуска-ўкраінскай граніцы таксама павінны мець пашпарты. У адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, гэтай катэгорыі грамадзян яны выдаюцца толькі для загранпаездак, таму дазвольны запіс у названыя дакументы прастаўляецца ўжо з самага пачатку.

Непаўналетнія (да 18 гадоў), якія выязджаюць ва Украіну без суправаджэння законных прадстаўнікоў (бацькоў, апекуноў і г.д.), пры перасячэнні граніцы абавязаны мець іх пісьмовы дазвол, завераны ва ўстаноўленым парадку. Уезд на тэрыторыю Украіны для лячэння, аздараўлення або кансультацыі па гэтых пытаннях магчымы і ў суправаджэнні аднаго з законных прадстаўнікоў (або па яго пісьмовай згодзе), але пры наяўнасці дакументаў, што пацвярджаюць гэтыя абставіны. Аналагічны парадак прадугледжаны і пры выездзе грамадзян Рэспублікі Беларусь ва ўсе краіны — удзельніцы СНД (уключаючы дзяржавы — члены ЕўрАзЭС), акрамя Туркменістана.

У МУС звярнулі ўвагу на тое, што выезд у трэція краіны і Туркменістан праз дзяржавы — члены ЕўрАзЭС ажыццяўляецца па пашпарце, аформленым для выезду за мяжу і пры ўмове наяўнасці ўязной візы. Гэта правіла не распаўсюджваецца на выпадкі перамяшчэння з адной дзяржавы Супольніцтва ў іншую, а таксама пры выездзе ў дзяржавы — удзельніцы СНД.

ВНИМАНИЕ!

На электричке в Молодечно не доедешь

Движение электропоездов в направлениях Минск—Молодечно и Молодечно—Минск с 4.30 до 19.35 23 и 25 апреля осуществляться не будет.

Как сообщает управление Белорусской железной дороги, движение будет остановлено в связи с ремонтом моста на перегоне Уша—Молодечно. Электропоезда, отправляющиеся со станции "Минск-Пассажирский", будут следовать только до станции "Уша" и обратно. Электропоезда, отправляющиеся со станции "Молодечно", в указанный период будут сняты.

В управлении БЖД отметили, что пассажиров от станции "Молодечно" до станции "Уша" и обратно будут перевозить автобусы по железнодорожным билетам. Заезд автобусов на о.п.Фестивальный, Селивоновка, Криница, Татарщизна, Мясота осуществляться не будет. О подробном изменении расписания поездов от Минска до Молодечно можно узнать в справочной службе БЖД.

Лилия ВОРОНОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
19 КРАСАВІКА 2007 г.

Да перамогі над карупцыяй далёка...

Пракуратура Мінска расследуе шэраг крымінальных спраў у дачыненні да службовых асоб, якія здзейснілі злачынствы супраць інтарэсаў службы.

Калі гаварыць звычайнай мовай, то справа ідзе пра карупцыйныя злачынствы. Так, за 2006 год і першы квартал 2007 года ў Мінску іх зафіксавана больш за пяцьсот. З іх 258 фактаў хабарніцтва.

Узбуджана больш за 100 крымінальных спраў пра крадзеж маёмасці шляхам злоўжывання службовым становішчам.

Сённяшні суд у Беларусі

Мне давялося колькі разоў быць на судах прадстаўнікоў апазіцыі. Хачу падзяліцца ўражаннем. Схема простая, як граблі: 1) сведкі-міліцыянеры (іншых суддзя ўвогуле не хоча бачыць, хоць адвакат прапануе); 2) зачытваюцца рапарты сведкаў, напісаныя адзін у адзін (мабыць пад кальку); 3) гавораць сведкі (звычайна са спецпадраздзяленняў міліцыі) зноў пад кальку: або брыдкасловіў, або спраўляў прылюдна малую патрэбу. Далей суддзя прызнае, што сведчанні абсалютна даставерныя, не падлягаюць сумневу, прысуд — ад 5 да 15 сутак зняволення або памілаванне з-за нязначнасці парушэння (у залежнасці ад сённяшніх патрабаванняў улады).

А зараз паспрабуем глянуць збоку, уявім такія карцінкі: 1. Гаворыць жонка суддзі Першамайскага раёна Мінска: "Прыйшоў дадому, хапаецца за сэрца, ледзьве не стогне: "Атрымаў загад ад начальства: калі не засаджу на суткі, магу надалей не лічыць сябе нават юрыстам".

2. Сяржант, які сведчыць у судзе, разважае: "Я збег з разваленага саўгаса, уладкаваўся на працу ў міліцыю. Зараз маю добры аклад, жыву ў інтэрнаце. Калі не выканаю загад засведчыць, што гэты нядобрае рабіў у падваротні, альбо што той брыдкасловіў, адразу выганяць са службы. Акрамя таго, нам штодзённа распавядаюць, што апазіцыя — гэта ворагі народа, што яны прадаліся заграніцы, якая хоча нам нашкодзіць".

3. Гэты сяржант (малаадукаваны, 20-гадовы хлапец з вёскі, цалкам залежны ад начальніка), мабыць, ідучы ў суд, яшчэ спадзяваўся, што калі і схлусіць, то праўда ж заўсёды пераможа, бо суддзя ўсё вырашыць па праўдзе. "Такім чынам, — заспакойваў ён сябе, — мяне прымусілі схлусіць, але, па-першае, яны ўсё роўна ворагі народа, а па-другое, калі што не так, суддзя паправіць. І будзе ўсё ў парадку", — думаў ён.

4. Гэты суддзя думае: "Віна перад небам не на мне, бо я маю пэўнае сведчанне і яшчэ страшэнны загад начальства. Акрамя таго, нам добра тлумачаць штодзённа, што гэта ворагі народа".

5. Спытайце ў сваіх знаёмых. Нідзе вы не пачуеце, што хто-небудзь з так званых простых людзей быў затрыманы і асуджаны за лаянку ці непрыстойныя паводзіны. Такі "гонар" — прэрагатыва толькі рафінаванай інтэлігенцыі, якая ўзначальвае апазіцыю.

6. У выніку: 1) выхадзец з вёскі (міліцыянт) застаецца ўнутры псіхалагічна цалкам зруйнаваны; 2) суддзя штодзённа ўгаворвае сябе, што не меў іншага выйсця, а што апазіцыя сама вінавата, што давяла сітуацыю да такога. Не выключаны і іншыя вынікі. Напрыклад, псіхічныя захворванні; 3) краіна існуе ў варунках боязі кожнага чалавека за заўтрашні дзень.

Насамрэч маем: сённяшняя ўлада зруйнавала мараль, эканоміку, культуру.

Такое доўжыцца не можа, бо гэта суцэльны тупік у жыцці народа.

А.ГАЕЎСКІ,
мінскі пенсіянер.

ПРАЕКТ

Радыкальны варыянт

Нядаўна ездзіла ў Літву і, як заўсёды, купляла ў краме duty free тое-сёе. Гандляркі сказалі, што хутка іх зачыняць, нібыта прынята такое рашэнне. Што за глупства, ва ўсім свеце на мяжы ёсць магазіны бяспошліннага гандлю! Хто да гэтага дадумаўся?

Аліна Краскоўская,
г.Гродна.

Спадарыня Аліна, рашэнне пакуль не прынята. Але сапраўды распрацаваны адпаведны праект указа прэзідэнта. Згодна з дакументам, крамы бяспошліннага гандлю плануюць пакінуць толькі ў аэрапорце "Мінск-2" і для абслугоўвання дыпламатычных прадстаўніцтваў і місій. Дарэчы, гэтым жа дакументам прадугледжана, што для памяншэння сацыяльнай напружанасці працаўладкаванне супрацоўнікаў крам duty free будзе ў мясцовыя прадпрыемствы гандлю.

Нядаўна ў сістэме гандлю duty free адбыўся скандал. Праверка Камітэта дзяржкантролю выявіла, што праз крамы бяспошліннага гандлю праходзяць аптовыя схемы пазапраўнай рэалізацыі алкаголю. З таго і пачалося так званае "рэфармаванне"... Адны ведамствы прапаноўвалі нічога не мяняць, а проста ўзмацніць кантроль над рухам тавараў у такіх крамах, другія — наогул зачыніць, каб не было праблемы. Зараз на разглядзе ў Адміністрацыі прэзідэнта знаходзіцца радыкальны варыянт.

Дарэчы, па даных Мінстата Беларусі, за 2006 г імпарт моцных спіртных напояў крамамі бяспошліннага гандлю склаў 0,699 млн долараў на суму 24,221 млн долараў (75% ад агульнага аб'ёму імпарту гэтай прадукцыі). Гэта не проста шмат, а вельмі і вельмі шмат!

Алег СНОЎ.

РОЗДУМ

Якую дзяржаву мы будуем,

або Хто ў Беларусі разыгрывае рускую карту?

З чаго б гэта апошнім часам Крэмль, як і ў савецкія часы, стаў надаваць такую вялізную ўвагу рускай мове? 2007 год у Расіі аб'яўлены годам рускай мовы. 16 лютага У.Пуцін і наогул заявіў на ўсю Федэрацыю, дзе пражывае 160 народаў і народнасцяў: *"Русский язык — это государственнообразующий фактор"*, што сталася сігналам для таго, каб Дзярждума ўжо 22 лютага адхіліла праект Дамовы аб размежаванні паўнамоцтваў паміж Рэспублікай Татарстан і Федэрацыяй. Там, між іншым, было патрабаваннем да кандыдатаў у прэзідэнты Татарстана веданне татарскай мовы (вось бы ў Беларусі было падобнае патрабаванне!). Расійскія тэлеканалы, падаючы гэтую інфармацыю, з экстазам дадавалі: *"...несмотря на то, что сам президент Владимир Путин представил этот проект для утверждения в Госдуму..."* Вось такія імперскія гульні!

Сапраўды, руская мова ўтварыла (аб'яднала) Русь, потым і Расійскую імперыю, у склад якой у якасці калоніі была ўключана і наша Беларусь ("Северо-Западный край"). Затым руская мова "аб'яднала" народы СССР і сацыялістычны лагер. Праўда, усё гэта не вытрымала выпрабавання і лянулася, а руская мова не здолела стаць "цементирующим языком", аказалася амаль такой жа нацыянальнай мовай (рускага народа), як і іншыя нацыянальныя мовы былых народаў СССР.

З крыўды за распад савецкай імперыі і паніжэнне фактычнага статусу рускай мовы ад "обязательно изучаемой" да "добровольно изучаемой" у колішніх рэспубліках СССР (акрамя Беларусі!) і ўзнік у Расіі фашысцкі рух-рэванш. Адсюль і забойствы на нацыянальнай глебе, і воклічы супраць "инородцев" *"Понаехали тут!"* (у імперыях іначай не бывае). Зноў уздымаецца лозунг "великоруссизма" пад інфармацыйным прыкрыццём "собирания славян". Неўтаймаваны "собиратель" Дзмітрый Рагозін, які ўзначальвае "Конгресс русских общин" (заўважце, як настырна наведваюць Беларусь падобныя "собиратели" — праханавы, жырыноўскія, зюганавы, рагозіны і г.д.) даў нядаўна інтэрв'ю аднаму з беларускіх тэлеканалаў, у якім, у прыватнасці, сказаў, што неабходна *"склеить разбитую славянскую чашку"* (маецца на ўвазе распад СССР), што *"русские, украинцы и белорусы вместе уникальная славянская нация"*. Акрамя таго Д.Рагозін лічыць, што трэба *"закрепить русское население* (заўважце, шавіністы рэдка называюць народ народам, а толькі "населением". — **А.Р.**) *на Кавказе"*. Як я ўжо казаў раней, гэта не што іншае, як комплекс нацыянальнай непаўнавартаснасці рускага народа, які аказаўся без сваёй "великой Родины — СССР" і цяпер, у адрозненне ад іншых народаў, не мае свайго дзяржаўнага ўтварэння і шукае апору ў мінулым.

Нядаўна адзін расійскі тэлеканал паказаў фільм пра забойствы ў Санкт-Пецярбургу, здзейсненыя на глебе нацыянальнай нянавісці да "инородцев" — нярускіх. Адна толькі група падлеткаў "Бешеная толпа", чыёй літаратурай з'яўляецца "Майн Кампф" Гітлера, у 2003 годзе забівае цыганскую дзяўчыну, у 2004-м — дзевяцігадовую таджыкскую дзяўчынку (на вачах у бацькі!), затым — в'етнамскага студэнта і якута. Усяго за гэты час былі забіты каля дзесяці чалавек, у тым ліку — сенегальскі студэнт, грамадзянкі Кыргызстана і Азербайджана... Гэта — вынік імперскай палітыкі Крамля. Але самае трывожнае: 14 чалавек, падазроных у забойстве, выпушчаны на свабоду! За гэтымі падлеткамі, вядома, стаяць дарослыя. Пакуль дзяржава не вырашае (імперыя ніколі не вырашае) нацыянальныя праблемы, іх "вырашаюць" банды "патриотов". Разам з ростам колькасці забойстваў на нацыянальнай глебе расце ў Расіі і колькасць... нацысцкіх сайтаў.

А ці можна наогул выхаваць патрыятызм на комплексе непаўнавартаснасці? Вось гэта зараз і спрабуе вырашыць сённяшняя "белорусская власть". І "вырашае" — без вырашэння галоўнай праблемы беларускага народа: без вяртання яму спрадвечнай духоўнай нацыянальнай каштоўнасці — роднай мовы, адсутнасць якой у грамадстве, уласна кажучы, і стварае ўвесь комплекс нацыянальнай непаўнавартаснасці беларусаў. Усе народы — з роднымі мовамі, толькі мы — з чужой. Відаць, "белорусская власть" моцна пакрыўдзілася на народнага паэта Ніла Гілевіча за тое, што не змагла "купіць" за 30 срэбраных вялікага змагара за родную мову, як гэта ёй удалося зрабіць з некаторымі "деятелями национальной культуры". Значыць, трэба даць мове пад дых! Няхай змагар адчуе! О, як улада любіць здзекавацца з тых, хто вышэй за яе. Ды толькі скарыць іх дух яна не ў стане.

Але вернемся ў Расію.

Я згодны з расійскім прэзідэнтам: родная мова — гэта нацыятворны і дзяржаватворны фактар. Чужая мова ніколі не зможа аб'яднаць адзін ці некалькі народаў, калі ў іх ёсць свая. У тых жа, напрыклад, татараў свая ёсць, і руская для іх — не такая ўжо і родная! Ці не таму Крэмль забараніў татарам (з трэцяга разу) лацінку, якая лепш, чым кірыліца, перадае гукі татарскай мовы, і пакінуў кірыліцу? Сталін знішчаў арабскі алфавіт у мусульманскіх народаў, Пуцін знішчае лацінку. Для чаго?

Як вядома, Сталін будаваў сваю імперыю, а нацыяналізм (патрыятызм) кожнага са 190 народаў былога СССР перашкаджаў яму рабіць гэта. Прасцей было перавесці ўсе народы на адну мову — рускую. Няма моў — няма народаў — няма праблем. Пуцін "со товарищи" вырашыў таксама будаваць імперыю (у які там раз — пяты?). Але дзеля гэтага трэба знішчыць нацыянальныя мовы народаў, іх культуры, асіміляваць гэтыя народы, перавесці на адну мову — рускую, уніфікаваць нацыянальныя культуры і прывесці іх да адной: касмапалітычнай, безнацыянальнай, хімерычнай эрзац-культуры, якая потым прыводзіць каланіяльныя народы да бескультур'я, бездухоўнасці і вымірання.

Такі лёс усіх каланіяльных народаў, у тым ліку і беларускага. Ці не таму вымірае беларус, выміраюць народы Расіі (па мільёну ў год!), што метраполія (Масква) знішчыла традыцыйны ўклад іх жыцця і не пакінула апірышча, якое даў кожнаму народу Бог, — **МОВУ**? Цяпер разумееце, чаму ў Татарстане душаць татарскую мову, як у Беларусі беларускую? Бо пакуль будзе жыць татарская (беларуская) мова, будзе жыць татарскі (беларускі) народ (як і многія іншыя). І датуль Крамлю не ўдасца зламаць незалежнасць народаў, іх волю да свабоды і дэмакратыі. Датуль яму не ўдасца асіміляваць татараў, а потым жа сказаць, што "русские и татары — один народ" (як ён сказаў беларусам). А "один народ" праглынуў гэтыя словы і змаўчаў...

А якую дзяржаву на рускай мове вось ужо больш за 200 год будуюць беларусы? На прэс-канферэнцыі прадстаўнікам СМІ Украіны А.Лукашэнка сказаў: *"Белорусский язык мы не разыгрываем в политических целях. Это не карта"*. На пытанне *"Хто такія "мы"?"* яшчэ раней, даючы прэс-канферэнцыю прадстаўнікам СМІ Расіі, ён сказаў так: *"Здесь* (у Беларусі. — **А.Р.**) *ничего не осталось* (пасля распаду СССР. — **А.Р.**), *здесь остались осколки — осколок КГБ, осколок МВД, осколок Госплана. То есть это части, это были отделы, и из этого надо было формировать государственные органы, надо было создавать государство"*. Калі верыць прэзідэнту (не верыць жа "ўсенароднаабранаму" нельга), то аказваецца, што "создают государство" — нашу, незалежную дзяржаву — "осколки", "отделы" КГБ СССР, МВД СССР, Госплана СССР! Яны *"белорусский язык не разыгрывают в политических целях"*, як гэта было ў СССР, затое разыгрываюць, як карту, в политических целях" рускую мову. Так было ў СССР. ЯНЫ на рускай мове зараз будуюць у Беларусі нешта рускае — губерню Расіі, калонію Расіі...

На маю думку, яны будуюць пратэктарат Расіі. *"ПРОТЕКТОРАТ: 1. Форма зависимости, при которой слабая страна, формально сохраняя свое государственное устройство и некоторую самостоятельность во внутренних делах, фактически подчинена сильной империалистической державе. 2. Страна, находящаяся в такой зависимости"* (С.Ожэгаў). Пратэктарат — самая гнюсная форма каланіяльнага паняволення таму, што гэта паняволенне закамуфліраванае, прыхаванае, якое просты народ не адчувае. Так і беларусы пакуль не адчуваюць таго, што нарабіў Крэмль ("КГБ, МВД, Госплан") за гэтыя 12 год у Беларусі. Але адчуюць!

Калі газа-нафтавая вайна — не чарговы саюзны спектакль-скандал паміж Расіяй і Беларуссю, то А.Лукашэнку цяжка будзе выбрацца з таго кута, у які ён сам сябе загнаў. Мяркуйце самі. Паміж Расіяй і Беларуссю створана (адноўлена) агульная інфармацыйная прастора, якую кантралюе Крэмль. Адноўлена адна агульнаадукацыйная прастора, якую таксама кантралюе Крэмль, як і агульная савецкая "культурная" прастора, якую кантралюе Крэмль і ў якой дамінуе рускамоўнае безнацыянальнае бескультур'е. Самае страшнае для нас — знішчана беларускамоўная адукацыя, а нацыянальная культура пераведзена на чужую мову (уявіце сабе рускую культуру на татарскай мове!). Руская мова, як і ў каланіяльныя часы, выпампоўвае беларускія таленты ў Маскву і Санкт-Пецярбург. У Беларусі праводзіцца палітыка выціскання талентаў у Расію: ім на радзіме не ствараюцца ўмовы для творчасці і працы. (Дык хто каго ў Беларусі "пасадзіў на чамаданы": Шушкевіч з Пазьняком — рускіх ці Лукашэнка — беларусаў?).

Гэты працэс таксама кантралюе Масква. Расіі выгадна мець таленты (усе імперыі выпампоўваюць іх са сваіх калоній), а Беларусі — не, таму яна за гэты час стала фактычна яшчэ большай правінцыяй Расіі — яе пратэктаратам. І тое, што народ маўчыць, — гэта паказчык дэградацыі нашага грамадства, яго духоўнай стомленасці, адсутнасці нацыянальнай свядомасці, наяўнасці каланіяльнай забітасці і неразумення сітуацыі ў краіне. Я ўжо не кажу пра дэградацыю моладзі, падлеткаў, школьнікаў, якая выяўляецца ў іх паводзінах. Гэта больш чым сумныя вынікі каланіяльнай палітыкі — русіфікацыі беларусаў, якая і прывяла да паступовага вымірання нашага народа. Сапраўдная гуманітарная катастрофа!

А.Лукашэнка часта паўтарае: *"По своему менталитету белорусы — самый интернациональный народ"*. Не ўсе ўсведамляюць, што значыць *"интернациональный"*, таму гэтым словам, як і словам "двуязычие", любяць карыстацца наменклатуршчыкі, адарваныя ад сваіх нацыянальных каранёў. *"Інтэр"* азначае *"паміж"*, а "паміж" — гэта не нацыя, не нацыянальнасць і не народ, а ўсяго толькі адлегласць (прамежак, прамежнасць) паміж народамі — словам, дзірка ад абаранка. Гэта зусім не той сэнс, які ўклаў у свой верш "Маладая Беларусь" Янка Купала, калі казаў: *"...Занімай, Беларусь маладая мая, /Свой пачэсны пасад між народамі!.."* Як можа заняць "пасад", ды яшчэ "пачэсны" тое, чаго няма? Няма мовы — няма народа, няма дзяржавы. Ці не таму Міністэрства культуры "заваліла" ў свой час другі конкурс на напісанне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь: па загадзе Масквы для "самого интернационального народа" і пакінула малазмененым савецкі гімн? Спасылкі на тое, што ў Беларусі няма кампазітараў ці яны слабыя, — гэта савецкая шавіністычная хлусня ў тым жа духу, што і *"белорусский язык — бедный язык"* (А.Лукашэнка). Проста трэба было "осколкам КГБ" і г.д. "создавать государство" — пратэктарат Расіі, таму і трэба было захаваць савецкі каланіяльны беларускі гімн, бо такі ж савецкі — імперскі гімн пакінула сабе метраполія — Масква ў чаканні "интернационального союзного соития с Беларусью". А чытачам газеты скажу, што "Патриотическая песнь" нашага земляка Міхайлы Глінкі, якая пэўны час была гімнам Расіі, — нашмат больш якасная музыка, чым гімн СССР А.Аляксандрава, які зараз зноў (у другі раз, як і савецкі ў Беларусі) з'яўляецца гімнам Расійскай Федэрацыі.

..."Интернациональный народ" — гэта як "жывы труп", бо кожны чалавек, кожны народ маюць сваю якасць — нацыянальнасць. І ў тым, што беларусы — *"народ-паміж"* — наша (і першага прэзідэнта) трагедыя.

P.S. Пакуль пісаў артыкул, прачытаў у "Народнай волі" жарт С.Калякіна: *"ЗША думаюць, што Расія мае ўласны план па Беларусі, але ён настолькі глыбока захаваны, што даегэтуль не могуць гэты план выявіць"*. Паважаны Сяргей Іванавіч! План Крамля па Беларусі ляжыць на паверхні, таму яго і не бачаць ні Амерыка, ні Еўрасаюз, ні "белорусская оппозиция". Гэты план нядаўна ўслых агучыў сам Уладзімір Пуцін: *"Русский язык — это государственнообразующий фактор"*, што азначае далейшую палітыку русіфікацыі — духоўна-этнічнага генацыду і народаў Расіі (акрамя рускага), і Беларусі. А 12 сакавіка тэлеканал "Россия" перадаў, што ў Адэсе (Украіна) рускай мове хочуць надаць статус рэгіянальнай. Не ўдалося зрабіць яе там дзяржаўнай, дык зробім хоць рэгіянальнай... Відавочна, што газа-нафтавая вайна ў дачыненнях да Украіны і Беларусі аказалася малаэфектыўнай. Затое руская мова — мацнейшая за расійскія газ і нафту, бо і ва Украіне, і ў Беларусі за яе не трэба нічога плаціць, яна на першы погляд бясплатная. Але ўдумайцеся ў словы расійскага палітолага С.Чарнышова, якія пераклікаюцца са словамі У.Пуціна: *"Расія — гэта перш за ўсё руская мова, а не тэрыторыя"*. Сумяшчаючы думкі С.Чарнышова і У.Пуціна, атрымаем адказ і Амерыцы, і Еўрасаюзу, і "белорусской оппозиции": *"Там, дзе руская мова — там руская тэрыторыя і руская дзяржава"*.

Але беларусам не трэба плакацца, трэба, нарэшце, усвядоміць, што палітыка русіфікацыі ў Беларусі — гэта каланіяльная палітыка Масквы, што ўлада тут прамаскоўская, марыянеткавая, якая будуе не беларускую Беларусь, а рускую Русь (*"белорусы — это русские со знаком качества"* — А.Лукашэнка).

Прыслухаемся да голасу вялікага Паэта Беларусі Ніла Сымонавіча Гілевіча, нястомнага змагара за нацыянальную мову, якая, на яго думку, з'яўляецца адзіным гарантам Незалежнасці Беларусі, яе Свабоды і Дэмакратыі. Яшчэ ў мінулым стагоддзі Паэт, якога так баіцца антынародная ўлада, сказаў: *"Свабоду для Беларусі і для беларускай мовы можа здабыць толькі народ, узброены роднымі словам! І заяваць гэтым словам трэба цяпер, а не некалі пасля"*.

Удумайся, народзе, у сэнс сказанага: *"роднае слова — родная зброя"* і вырашы, ці сваю дзяржаву будуеш ты пры дапамозе чужой зброі?!

Алесь РАШЧЫНСКІ,
кампазітар.

МЕРКАВАННЕ

На калені Казулін не стане

Памятаеце, як А.Лукашэнка чыхвосціў А.Казуліна за тое, што ён некалі "хрюкал у корыта", а цяпер... Скажыце, Аляксандр Рыгоравіч, а хто ж яго далучыў да таго "корыта"? Ці ж не Вы? Будзем шчырымі: у той час, калі Казулін быў спачатку намеснікам міністра, а потым рэктарам, у БДУ паступалі і вучыліся Вашы сыны з усімі выцякаючымі адсюль пытаннямі. Менавіта тады Вы ўпершыню ў гісторыі Беларусі звычайнага рэктара (няхай сабе і БДУ) узвялі ў ранг міністра.

Адваротнае ў адносінах А.Лукашэнкі да А.Казуліна пачалося з моманту, калі студэнты БДУ ў сваёй большасці прагаласавалі супраць А.Лукашэнкі падчас прэзідэнцкіх выбараў. Да гэтага паступова дабаўлялася і тое, што А.Казулін, як сумленны чалавек і як рэктар у рангу міністра, паслядоўна і рашуча заставаўся заўжды верным сынам сваёй БЕЛАРУСКАЙ РАДЗІМЫ, не здольным на здраду ёй. Доказ таму — ператварэнне двара БДУ ў гістарычны помнік развіцця беларускай нацыянальнай эліты, прыкладаў чаму ў Беларусі няма. Гэта пры ім паспяхова скончыў універсітэт малады апазіцыянер Павел Севярынец, хоць некаторыя "гарачыя галовы" прапаноўвалі вытурыць яго без дыплома.

Пасля ўсяго гэтага з розных нагод (а часцей — і зусім без іх) А.Казулін быў пазбаўлены не толькі ўсіх сваіх высокіх пасад, але і працы. Але гэта не зламала яго як чалавека моцнага, надзеленага аналітычным розумам і высокім сумленнем, рашуча скіраванага на павагу да сваёй роднай Беларусі, на дапамогу ёй захавацца і прагрэсіўна развівацца менавіта з беларускасамастойнай дзяржаўнасцю. Таму ён адразу распачаў адкрытую антылукашэнкаўскую дзейнасць з выхадам не толькі на ўсю краіну, але і на агульначалавечую супольнасць.

Гэта толькі ён мог кінуцца на лукашэнкаўскую ахову, каб прабіцца (на законных падставах, як кандыдат на пасаду прэзідэнта) на так званы ўсебеларускі сход. Яго мэтай пры гэтым было публічнае выступленне з раскрыццём сутнасці лукашызму, яго пагрозы для беларускага народа.

Гэта толькі ён мог застацца змагаром і пасля выбараў. І велізарным злачынствам на дзяржаўным узроўні з'яўляецца хлусня лукашэнкаўцаў аб тым, што А.Казулін 25 сакавіка 2006 года падчас мітынгу мінчан, у гонар гадавіны абвяшчэння БНР кінуўся біцца з адборнымі амапаўцамі. Як сведка ўсяго, што тады адбывалася, сцвярджаю: было адваротнае. Амапаўцы, відаць, маючы пэўны загад на захоп (а можа, і знішчэнне пры адпаведных умовах) А.Казуліна, пачалі груба цягнуць яго ў машыну. Ён жа, нечакана зняважаны так, як ніколі на працягу ўсяго свайго жыцця, імкнуўся, вядома ж, абараняцца. Але ж сілы былі няроўныя, і яго пацягнулі. А потым, як ужо вядома, моцна білі ў машыне.

І гэта толькі ён, Аляксандр Казулін, змог свядома і мэтанакіравана пайсці на такую вельмі рызыкоўную для яго жыцця бестэрміновую галадоўку, якая прымусіла нават у ААН заняцца разглядам пытання па Беларусі. І непазбежна надыдзе час, калі на МІЖНАРОДНЫМ СУДЗЕ будуць расстаўлены кропкі над "і". А беларускі народ, даведаўшыся праўду, назаве А.Казуліна сапраўдным героем сучаснасці, паслядоўнікам Кастуся Каліноўскага. Гэта будзе непазбежна! Бо Бог на свеце ЁСЦЬ!

І не дачакаецца А.Лукашэнка прашэння ад А.Казуліна аб памілаванні. На калені ён не стане!

Аляксей САЛАМОНАЎ,
доктар тэхнічных навук,
прафесар.

ШЧЫРА

А дзе ж тыя песні?

Паважаныя супрацоўнікі газеты "Народная воля", вельмі ж мне захацелася падзякаваць за артыкул "Ой, сівы конь бяжыць...". Быццам я пабывала ў сваёй маладосці і слухаю спевы аднавяскоўцаў і мамы. І мае дзеці добра запомнілі, як ім мая мама спявала "Ой, дымна поле, дымна, там нікога не відна..." і іншыя народныя беларускія напевы...

А дзе ж яны падзеліся сёння? Не чуваць амаль зусім. У былой радыёперадачы "Спявай, душа народная!" часам магло не прагучаць ніводнай беларускай песні, а дазваніцца да рэдакцыі і выказаць сваю нязгоду мне так і не ўдавалася.

Чаму цяпер у такім загоне наша родная мова? Асабліва на тэлебачанні. Заўжды гляджу з радасцю тэлепраграму "Новыя падарожжы дылетанта", бо яна напамінае, што мы — беларусы. Але яе ганяюць з канала на канал, не даюць пэўнага, пастаяннага часу.

З задавальненнем паглядзела 25 сакавіка перадачу "Паэты і празаікі". Як хораша на душы стала! Дзякуй і паклон да зямлі стваральнікам перадачы за добрыя словы пра нашых слынных творцаў, асабліва Васіля Быкава. Як бачыце, добрае мы заўважаем, калі яно ёсць.

Шкада, што такіх перадач няшмат. Можа, нашы ўнукі і праўнукі будуць больш паважлівыя да сваёй сапраўднай гісторыі і мовы? Хай сабе вывучаюць і кітайскую, але сваёй, роднай, не выракаюцца. Яна ж такая меладычная, для песень створаная...

З павагай —

Яўгенія Мікалаеўна ФАДЗЕЕВА,
75 год.

ВПЕРВЫЕ

Вэнь Цзябао о непростых моментах

Премьер Госсовета КНР Вэнь Цзябао стал первым китайским премьером, который выступил с речью в японском парламенте.

В этой речи он призвал Японию примириться со своим прошлым и рассказал о том, какими Пекин видит стратегические отношения Китая и Японии. Вообще, он стал первым за последние семь лет китайским премьером, приехавшим в Японию.

Вэнь Цзябао начал выступление с того, что подчеркнул свое желание крепить дружбу и сотрудничество между двумя странами, однако большая часть его речи была посвящена непростым моментам совместной истории Японии и Китая.

Он сказал, что в результате японского вторжения в Китай в 1930—1940-х годах погибло огромное число китайцев, отметив при этом, что пострадал и японский народ. По мнению премьера Госсовета КНР, вина за агрессию лежит на японских военных правителях.

Вэнь Цзябао заявил, что извинения японских властей за те события должны сопровождаться, как он выразился, конкретными действиями. По словам корреспондента Би-Би-Си в Токио Криса Хогга, некоторые наблюдатели расценили это заявление китайского премьера как призыв к главе японского правительства Синдзо Абэ не посещать мемориал Ясукуни. Мемориал посвящен двум с половиной миллионам японцев, погибшим во время Второй мировой войны. Китай и Южная Корея считают его символом японской агрессии в годы Второй мировой войны.

В своей речи в японском парламенте Вэнь Цзябао в оптимистичных тонах описал перспективы отношений Токио и Пекина. Он выразил надежду на то, что стороны найдут мирное решение спора о том, кому принадлежат нефтегазовые запасы в Восточно-Китайском море. Как отметил премьер госсовета КНР, экономическое развитие являет собой хороший шанс, а не угрозу.

На фото: *премьер-министр КНР Вэнь Цзябао позанимался китайской гимнастикой вместе с японцами в парке Токио.*

ХОДЯТ СЛУХИ

Джордж и Лора решили развестись?

В США появились сообщения о вероятном разводе Джорджа Буша с супругой. Они якобы заключили джентльменское соглашение — вместе тянуть лямку до конца президентского срока Джорджа, а потом разбегаются в разные стороны.

Расул Гамзатов говорил так: "Сижу в президиуме, а счастья нет". Вот и Лора сидит в Белом доме, как в золотой клетке, а счастья от этого не испытывает.

О том, что семейная лодка Бушей дала течь, говорили давно. Но только теперь стало ясно, что дело принимает серьезный оборот, — адвокаты Джорджа и Лоры якобы уже согласовали положения мирового соглашения о разводе. Согласно этому документу, Джордж должен отвалить Лоре 10 млн долларов. Один миллион она получит сразу, еще три с половиной — после того, как суд утвердит развод. Оставшиеся деньги — в течение следующих пяти с половиной лет. За это она обязуется быть рядом с Джорджем до конца января 2009 года, пока не истечет официальный срок его пребывания в Белом доме. Буш, со своей стороны, пообещал до завершения президентства относиться с "крайним уважением" к первой леди. Урегулированы и имущественные претензии: Лоре достанется вилла в Техасе, а Джорджу — знаменитое ранчо в Кроуфорде (Техас), где он принимал особо милых его сердцу иностранных гостей.

Что действительно произошло на Березовской ГРЭС, точно не знает никто. Точки над "і" расставят в ходе начатого разбирательства. А пока известно следующее... В начале первого ночи на электростанции видели вспышку молнии над двумя линиями электропередачи, по которым ведется основной отпуск электроэнергии. В 0.29 отключились два энергоблока — 3-й и 4-й.

Как говорят специалисты, в системе, к которой подключены эти линии, упало напряжение, поэтому сразу же сработала технологическая защита. В результате отключились два генератора третьего и четвертого энергоблоков, генераторы четырех газовых турбин и четыре котла. Грубо говоря, электростанция "села на ноль" и перестала вырабатывать электроэнергию. В таких случаях, чтобы потребители не остались без электроэнергии, предусмотрено автоматическое перераспределение нагрузки в системе энергоснабжения республики. Выработку мощностей Березовской ГРЭС взяли на себя Лукомльская ГРЭС, Минская ТЭЦ-4 и Гомельская ТЭЦ-2. Благо инцидент произошел ночью, когда оборудование работает с половинной нагрузкой, поэтому потребители оставались без света считанные минуты.

В результате осмотра основного оборудования, к которому незамедлительно приступил персонал станции, не было выявлено никаких замечаний и повреждений. Поэтому с 2 часов ночи, когда на ГРЭС по тревоге прибыли все ответственные лица, энергоблоки начали готовить к пуску. К 11.00 следующего дня энергоблоки вышли на режим полной загрузки.

Кстати, такие инциденты на электростанциях — большая редкость. Последний раз подобные события на Березовской ГРЭС происходили 31 мая 1979 года, когда станция полностью потеряла свою генерирующую мощность.

Василий МАТВЕЕВ.

АКЦЫЯ

Недзе расце і ваша сасонка

Сапраўды паэтычнай прыродаахоўнай акцыяй адзначылі 14 красавіка сёлетні Дзень лесу працаўнікі Віцебскага вытворчага сельскагаспадарчага аб'яднання. У гэты дзень у розных лясніцтвах вобласці было высаджана 1,4 мільёна дрэў — пераважна хваёвых, адпаведна колькасці жыхароў Віцебшчыны. На месцах пасадак усталяваны памятныя знакі — "Дзень лесу-2007".

Акрамя высадкі дрэў, у гэты дзень адбыліся конкурсы юных лесаводаў, экскурсіі школьнікаў у лесагадавальнікі і паляўнічыя гаспадаркі, выставы-дэманстрацыі лесанарыхтоўчай і лесапасадачнай тэхнікі, наведванні помнікаў прыроды і культурна-гістарычных славутасцяў на тэрыторыях лясгасаў.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

«Лішнія» студэнты?

Скарачэнне прыёму на бюджэтную форму навучання на 700 месцаў, якое аб'явіла ў 2007 годзе Міністэрства адукацыі, выклікала абурэнне. Тым больш што заканадаўства недвухсэнсоўна дэкларуе: павелічэнне прыёму на платнае навучанне за кошт скарачэння бюджэтных месцаў забараняецца.

Між тым Савет міністраў распісаў па гадах, ажно да 2010-га, патрэбнасці ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй. Цікавая, трэба сказаць, карціна атрымліваецца.

Прагноз балансу спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй (лічбы прыкладныя)

2007	2008	2009	2010
29.441	29.703	30.367	30.459

Прыём на бюджэтную форму навучання

2007	2008	2009	2010
30.839	30.639	30.604	30.825

Выпуск (паказчык прагнозны)

2007	2008	2009	2010
53.400	63.000	78.000	79.000

Прагназуемы "лішак" спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй лёгка пралічыць, адняўшы ад прагназуемага выпуску прагноз балансу (2007 год — 24 тысячы, 2008 — 33 тысячы, 2009 — 47.500, 2010 — 48.500). Усё гэта — "лішнія" студэнты.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ: «Кожны чацвёрты не даязджаў да месца размеркавання...»

Наколькі рашэнне Міністэрства адукацыі скараціць 700 бюджэтных месцаў упісваецца ў рамкі закона? Пра гэта "Народная воля" запыталася ў старшыні камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Здановіча.

— Беларусь сёння мае 397 тысяч студэнтаў; 48% з іх навучаюцца на бюджэтнай форме, 52% — на платнай, — гаворыць Здановіч. — Не мая справа тлумачыць крокі Міністэрства адукацыі. Але тым не менш. Я спрабаваў угледзець у гэтым парушэнне заканадаўства. У законе запісана так: "Забараняецца павелічэнне прыёму на платную форму навучання за кошт скарачэння бюджэтных месцаў". Дык вось: парушэнне было б у тым выпадку, калі б скараціўся прыём на бюджэтную форму юрыстаў, а на платную форму колькасць набору тых жа юрыстаў павялічылася. Гэтага не адбываецца.

Паказчык прыёму на бюджэтныя месцы заўсёды ўяўляў сабой крывую: то пад'ём, то падзенне. Апошнія гадоў 10 у Беларусі назіраўся рост прыёму на бюджэтную форму навучання, прычым стабільны рост — з адхіленнем чалавек на 50—70 у асобныя гады. Мы дасягнулі максімуму ўжо ў 2004 годзе. Таму і летась, і ў 2007 годзе адбываецца памяншэнне прыёму на бюджэтную форму навучання.

Дасюль не было заканадаўства, якое б рэгулявала прыезд бюджэтнікаў да месца працы. Пасля таго, як летам 2006 года ўступіла ў сілу заканадаўства аб абавязковым размеркаванні выпускнікоў у бюджэтнай сферы, іх прыездзе да месца працы і адпрацоўцы, — лічба "адказнікаў" скарацілася ў разы. Калі раней да месца размеркавання "не даязджаў" кожны чацвёрты, то зараз толькі каля 7—8% выпускнікоў-бюджэтнікаў не прыехалі да месца размеркавання. А гэта значыць, што ў нас крыху стабілізуецца сітуацыя, таму можна скараціць прыём на бюджэтную форму навучання. Але не дужа, не на палову — гэтыя 700 месцаў скараціць можна.

Паразважаем яшчэ вось над чым. У Беларусі — 397 тысяч студэнтаў. Гэта цудоўна. Але давайце задумаемся: праз 5 гадоў на рынку працы акажуцца амаль паўмільёна людзей з вышэйшай адукацыяй. І гэта на 10-мільённую рэспубліку. А колькі іх ужо ёсць! Трэба ж думаць, дзе гэтым людзям знайсці працу. Хочаш атрымліваць вышэйшую адукацыю, перашкаджаць ніхто не будзе — плаці і вучыся. Але ж ніхто не будзе гарантаваць і працу. А вось калі дзяржава бярэ на бясплатнае навучанне, то яна гарантуе і працу. Мінэканомікі пралічыла да 2015 года патрэбнасць дзяржавы ў кадрах з вышэйшай адукацыяй па ўсіх накірунках. Скарачэнне закране эканамістаў, юрыстаў, бухгалтараў, менеджэраў... — тыя спецыяльнасці, па якіх назіраецца лішак. А па іншых спецыяльнасцях (тэхнічнага, інжынерна-будаўнічага профілю), наадварот, наборы павялічацца.

Анатоль ПАЎЛАЎ, былы прарэктар БДУ: «Мы самі аплачваем вучобу дзяцей, і дзяржава тут ні пры чым»

— Відавочна адно: бюджэт пусты; з-за вядомых падзей утварылася дзірка, таму шукаюць, дзе можна "шчыпануць". Але бяруць не там, дзе сапраўды можна ўзяць, а — за кошт адукацыі, медыцыны — гэта мы праходзілі не адзін раз. Да прыкладу, бюджэт МУС ніхто "не абшчыпвае". Элементарны прыклад. Ёсць у нас раённы цэнтр Клецк. За савецкай уладай на ўвесь Клецкі раён было 30 з нечым міліцыянтаў, іх хапала. Цяпер — 150 міліцыянтаў, хаця колькасць насельніцтва ў раёне зменшылася. Але гэтага ніхто не бачыць...

Сёння ў ВНУ 52% студэнтаў навучаюцца платна. Калі дзяржава турбуецца пра сваю будучыню і хоча, каб гэтая будучыня ўвогуле была, то я, наадварот, зрабіў бы так, каб 52% студэнтаў вучыліся на бюджэтнай форме, а 48% — на платнай асноове. Але, падкрэсліваю, на бюджэтнай форме, не бясплатнай — бясплатнага нічога не бывае. Бо дзяржава вымушае студэнтаў-платнікаў двойчы плаціць за сваю адукацыю. У нармальнай дзяржаве сям'я, дзіця з якой вучыцца платна, мусіла б атрымаць кампенсацыю на адукацыю. Альбо зрабіць працей — проста павялічыць колькасць бюджэтных месцаў.

Увогуле апазіцыя ставіць задачу, каб 90—95% людзей, якія працуюць у "народнай гаспадарцы", даруйце за савецкі тэрмін, мелі вышэйшую адукацыю. Сёння лапатай і калуном нічога не даб'ешся. У Японіі больш за 90% рабочых маюць вышэйшую адукацыю; У Фінляндыі — 5 мільёнаў насельніцтва, на адукацыю і навуку бюджэт выдзяляе 5 мільярдаў долараў штогод.

Падобная пастаноўка пытання неправамоцная — гэта парушэнне правоў чалавека. Цывілізаваная дзяржава абавязана даць першае працоўнае месца, а права выпускніка — пагадзіцца ці адмовіцца. Лямант кшталту "дзяржава цябе вывучыла — ты абавязаны" — не мае пад сабой глебы. Не дзяржава вывучыла чалавека — бацькі самі аплачваюць навучанне дзяцей. Самі можаце падлічыць, колькі чалавек за 40 гадоў працоўнага стажу плаціць дзяржаве ў выглядзе падаткаў і тых адлічэнняў, якія проста забіраюць у нас. У валавым унутраным прадукце за мінулы год фонд заработнай платы склаў толькі 30 з лішкам працэнтаў. Гэта значыць, з кожнага зароблена беларусам рубля яму выплацілі толькі 30 з нечым капеек. А 70 капеек ці 65 забірае дзяржава на тыя ж патрэбы. Дык пры чым тут дзяржава?

Запісаў Георгій ГЛЕБУСЬ.

СУД!

«Фантамас» у камуфляжы

*10 год калоніі ўзмоцненага рэжыму — такое пакаранне вызначыў суд старшаму сяржанту **Станіславу РУДАКОВУ** (тут і далей імёны і прозвішчы зменены. — **Аўт.**), які служыў у войску па кантракце і жыў у гарнізонным гарадку Заслонава пад Лепелем.*

Стас быў патомным вайскоўцам: у тутэйшым гарнізоне ў розны час служылі ягоныя дзядуля, бацька і матчын брат. Сям'я, у якой ён рос і выхоўваўся, не належала да заможных, але і не бедавала. Між тым, паводле сведчанняў аднагодкаў асуджанага, Стас часцяком выказваўся ў тым сэнсе, што ён заслугоўвае лепшай долі і большых грошай, бо яны аснова чалавечага лёсу.

У той злашчасны восеньскі дзень, які ў Заслонаве не забудуць доўга, Стас Рудакоў быў вольны ад службы. Таму прысвяціў яго свайму ўлюбёнаму віду адпачынку — выпіўцы. Спярша забег да бабулі, якая адразу ж наліла ўнуку шклянку выраблена напярэдадні самагонкі. Да бабулінай "крыніцы" прыпадалі многія жыхары Заслонава, і Стас ведаў, што ў старой заўсёды ёсць вольныя грошы. Але на ягоную просьбу даць пэўную суму да палучкі бабуля адказала адмоўна. Гэта сапсавала Стасу настрой, і ён накіраваўся не дадому, а ў суседнюю шматпавярхоўку да свайго сябра і саслужыўца Сяргея Кавальчука, які тым часам знаходзіўся на службе.

Дома ў Кавальчукоў была Сяргеева жонка Марыя — хросная маці Стасавага сына Паўліка.

Уласна кажучы, у Стаса да кумы не было ніякіх спраў, але дарогаю ён раптам узгадаў, што Сяргей тыдзень таму прадаў нейкаму мінчуку сваю старую легкавушку за дзве з паловай тысячы долараў і гэтыя грошы захоўваюцца недзе дома.

"Там грошы, і там адна Марыя", — міжволі паўтаралася ў думках Стаса. Рашэнне завалодаць "зялёнымі" выспела імгненна і захапіла Рудакова. Часу ў яго было няшмат: Сяргей мог вярнуцца дадому нечакана. А трэба ж было падрыхтавацца ад чорнай справы.

Рыхтаваўся Стас па-вайсковаму спрытна. Забег да сябе, скінуў цывільную вопратку, апрануў чорны бушлат і гэткія ж штаны, нацягнуў на рукі пальчаткі, прыхапіў малаток і камуфляжную маску разведчыка.

Кавальчукі жылі ў суседнім пад'ездзе. Зайшоўшы туды, Стас напяліў маску і пазваніў у кватэру, адкуль даходзіў пах смажанага: Марыя чакала мужа са службы.

Адчыніўшы дзверы, жанчына атрымала такі моцны ўдар малатком па галаве, што ледзь паспела заўважыць маску з дзіркамі для вачэй, войкнула ад болю і павалілася на падлогу. Яе трохгадовая дачка Настачка спалохалася і зайшлася ў крыку і слязах.

"Мне чамусьці ўмомант прыгадалася слова "Фантамас", — распавядала потым следчаму ахвяра Стаса пра сваё першае ўражанне ад нязванага госця ў масцы.

Абліваючыся крывёй, Марыя намагалася ўстаць, але Рудакоў, не зважаючы на слёзы дзяўчынкі, працягваў біць куму па галаве малатком.

Жанчыне нічога не заставалася, як пайсці на хітрасць: яна прыкінулася мёртвай — знерухомела і заціхла. Стас, аднак, не адразу ж даў веры вачам: памацаўшы пульс у Марыі, ён зразумеў, што яна жывая. Але ці то жанчыну абараніў анёл-заступнік, ці то недзе ў глыбіні душы старшага сяржанта Рудакова варухнулася нешта чалавечае, але дабіваць куму ён не стаў, а кінуўся шукаць грошы: корпаўся ў шафе з бялізнай, сноўдаўся з аднаго пакоя ў другі.

Марыя ўсё гэта чула, але баялася варухнуцца. Тым больш што Настачка не супакойвалася: крычала і плакала на ўвесь дом, і яе маці баялася, што невядомы злодзей заб'е не адну яе, а і дзіця.

У адзін з момантаў, калі Стас адышоў ад Марыі ў пошуках грошай, збітая да паўсмерці жанчына, сабраўшы апошнія сілы, здолела ўзняцца з падлогі, выбегчы на лесвіцу і пачаць крычаць аб паратунку. Гэта вымусіла рабаўніка пакінуць чужую кватэру. Адразу ж ён пабег у суседні пад'езд, зайшоў дадому, хуценька пераапрануўся ў вайсковую камуфляжную форму, кінуў у вядро са смеццем пальчаткі, маску і малаток, узяў вядро і накіраваўся ў дом, дзе жылі бацькі ягонай жонкі і дзе, ён ведаў, знаходзілася і яна. Адтуль Стас разам з жонкай накіраваўся ў сваю кватэру, так і не выпускаючы з рукі вядра са смеццем.

Тым часам Сяргей Кавальчук, вярнуўся дадому і, убачыўшы акрываўленую Марыю і вырашыўшы, што яе спрабаваў забіць і абрабаваць нехта прыезджы, кінуўся да бліжэйшага аўтобуснага прыпынку, каб затрымаць злачынцу. Там ён накінуўся на нейкага незнаёмага хлопца, але хутка мусіў яго адпусціць з мірам, бо людзі на прыпынку давялі, што хлопец стаіць тут даўно і нікуды не адыходзіў.

Неўзабаве Сяргей убачыў, што праз двор ідзе Стас з вядром, а побач з ім — ягоная жонка Галіна, тэлефаністка з іхняга ж гарнізона. Сяргей пачаў узрушана распавядаць Стасу пра жудаснае здарэнне з Марыяй, а Рудакоў спачувальна ківаў галавой і абураўся, але чамусьці адмовіўся выклікаць па сваім мабільніку міліцыю з Лепеля. Прычыну нязгоды Сяргей зразумеў пазней, калі аператыўнікі прыехалі і пачалі апытанне магчымых сведкаў. Самым каштоўным з іх аказаўся шасцігадовы хлопчык, які, гуляючы ў двары з дзецьмі, запомніў дзіўнага чалавека, які ўваходзіў у адзін пад'езд у цывільнай вопратцы, выходзіў адтуль і заходзіў у суседні пад'езд у чорным бушлаце і чорных штанах, а потым раптам з'явіўся ў камуфляжы і з вядром. Міліцыянеры, не марудзячы, адвезлі Стаса Рудакова ў аддзяленне, і там кантрактнік адразу ж пачаў даваць праўдзівыя паказанні. "Гэта ўсё гарэлка вінаватая", — паўтараў Стас Рудакоў і ў час следства, і ў зале суда.

Акрамя знявалення, суд прызначыў рабаўніку яшчэ адно пакаранне: ён мусіць выплаціць Марыі Кавальчук вялікую суму грошай у якасці кампенсацыі матэрыяльнай і маральнай шкоды. Па іроніі лёсу гэтая кампенсацыя аказалася роўнай 2,5 тысячы ўмоўных адзінак — якраз столькі, колькі хацеў знайсці Стас у доме свайго сябра, саслужыўца і кума.

Грошы ён, вядома, верне — нікуды не дзенецца. Але вось хто кампенсуе маральную шкоду, якую нанёс 30-гадовы мужчына сваёй сям'і, свайму сыну, усёй сваёй радні, якая зусім нядаўна лічыла яго нармальным чалавекам. Так, сквапным. Так, не дужа прыязным да працы. Так, пітушчым. Але не здатным на такое злачынства, за якое асуджаны. "Гарэлка вінаватая", — у адзін голас паўтаралі ўсе жыхары Заслонава, каментуючы гэтае дзікунскае злачынства.

Можа, яны і маюць рацыю, але сама гарэлка нікому ў горла не ліецца...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ЧУЛІ?

У ліквідатараў застануцца толькі пасведчанні?

Ліквідатары аварыі на ЧАЭС будуць звяртацца да міжнароднай супольнасці ў выпадку прыняцця законапраекта, які адмяняе льготы для гэтай катэгорыі грамадзян.

Як паведаміў ініцыятар стварэння рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Ліквідатар" **Уладзімір ВАЛЧАНІН**, ён сустракаўся са старшынёй камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віталем Куліком. Падчас сустрэчы высветлілася, што распрацаваны законапраект, які адмяняе ўсе льготы для ліквідатараў, у тым ліку: штогадовае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне па накіраванні медкамісіі; пенсійнае забеспячэнне пры дасягненні 55-гадовага ўзросту; штогадовы дадатковы двухтыднёвы адпачынак, які аплачваецца; бясплатныя лекі.

"Пры прыняцці гэтага законапраекта будуць поўнасцю пазбаўлены льготаў грамадзяне, якія ў 1986—1987 гадах бралі ўдзел у ліквідацыі наступстваў Чарнобыля", — заявіў Уладзімір Валчанін. Ад імя сваіх калег ён прапанаваў В.Куліку правесці парламенцкія слуханні па гэтым законапраекце з удзелам ліквідатараў. *"Калі ж наша меркаванне не будзе пачута, мы пакідаем за сабою права звярнуцца ў міжнародныя арганізацыі"*, - падкрэсліў У.Валчанін.

Марат ГАРАВЫ.

Рэха Чарнобыля

За апошнія 15 гадоў колькасць інвалідаў-чарнобыльцаў павялічылася больш як у 6,5 раза. Пра гэта паведаміў начальнік аддзела сацыяльнай абароны дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях **Уладзімір КУДЗІН.**

Паводле яго слоў, калі на пачатку 1990-х гадоў колькасць інвалідаў-чарнобыльцаў складала 2 тыс. чалавек, дык цяпер іх колькасць перавышае 13 тысяч. *"На жаль, гэтая катэгорыя грамадзян, у якую ўключаны і дзеці з анкалагічнымі захворваннямі, з кожным годам павялічваецца"*, — падкрэсліў Уладзімір Кудзін.

Ул.інф.

Народная Воля http://www.nv-online.info
19 КРАСАВІКА 2007 г.

ПОСТАЦІ

Леў Сапега — бацька і збаўца Айчыны

450 год таму нарадзіўся Вялікі Канцлер ВКЛ

Сёння цяжка ўявіць, што мужны ваяр, мысляр, вялікі дзяржаўны дзеяч і дыпламат Леў Іванавіч Сапега ў маладыя гады збіраўся пайсці ў кляштар, стаць манахам, бо не бачыў сэнсу ў жыцці і не ведаў, на што скіраваць свае шматлікія таленты. Меланхолія — хвароба інтэлектуалаў. Да роспачных думак маладога Льва падштурхнула, так бы мовіць, ранняя сталасць. Ягоная чуллівая душа прыняла як сваё, роднае, адкрыццё біблейскага мысляра Эклезіяста: "Бачыў я ўсе справы, што робяцца пад сонцам, і вось — усё марнасць і знямога духу". Аднак не спраўдзіліся тыя намеры, і абраў Леў Сапега не цішыню кляштара, а поўнае трывог жыццё на карысць Бацькаўшчыны. Дзякуй богу, б інакш наша гісторыя была бы іншай...

Леў Сапега нарадзіўся ў 1557 годзе. Род свой Сапегі, паводле сямейнага падання, вялі ад князя Віценя (таго самага, што зрабіў "Пагоню" дзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўскага). Па нараджэнні хлопчыка хрысцілі паводле праваслаўнага абраду. Вучыўся Леў у прыватнай школе пры двары князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Дарэчы, школа была пратэстанцкая, але праваслаўных Сапегаў гэтая акалічнасць не бянтэжыла. Скончыўшы школу, хлопец (было яму трынаццаць гадоў) ведаў акрамя роднай беларускай, лацінскую, нямецкую, грэцкую, нямецкую і польскую мовы. Прадоўжыў адукацыю ў Германіі, у Лейпцыгскім універсітэце. Там Сапега захапіўся ідэямі Рэфармацыі, і нават перайшоў з праваслаўных у пратэстанты. Праўда, у пазнейшыя гады, калі палітычны прагматызм прывёў яго ў каталіцызм, Сапега цураўся гэтага ўчынку, тлумачыў яго адмоўным уплывам асяроддзя і недастатковым жыццёвым досведам.

Па вяртанні на радзіму Леў не адразу знайшоў сабе занятак, праз што меў згаданыя вышэй роспачныя думкі. Ягоны бацька адчуў душэўную знямогу сына, і каб той не бадзяўся дарма, не марнаваў час, накіраваў яго да караля Стэфана Баторыя. Так пачалася палітычная кар'ера Льва Сапегі. Кароль узяў Сапегу да сябе пісарам у 1580 годзе, а ўжо праз год ён займаў высокую пасаду Літвінскага гаспадарскага пісара. Баторый бярэ Сапегу з сабою і на вайну, і там Леў як мужны віцязь цалкам апраўдвае сваё імя.

Стэфан Баторый, беручы Сапегу на працу, сказаў: "Гэты юнак стане вялікім дзеячам для Рэспублікі (Рэчы Паспалітай)", і не памыліўся. З 1585 года Леў Сапега падканцлер Вялікага княства Літоўскага, з 1589-га — канцлер, з 1623-га — ваявода Віленскі, з 1625-га — Вялікі гетман ВКЛ. Такія асноўныя вехі ягонага палітычнага жыцця. Трэба адзначыць, што дзейнасць Сапегі прыпадае на вельмі складаны перыяд у гісторыі Вялікага княства Літоўскага. Дэклараванае раўнапраўе "Літвы і Кароны" на справе не атрымлівалася. Скарыстоўваючы знешнепалітычныя праблемы "Літвы", "Карона" чыніць на яе непрыхаваны ціск, маючы мэтаю падпарадкаваць, а калі атрымаецца, дык і праглынуць хаўрусніка. Прасцей кажучы, ператварыць Рэч Паспалітую Абодвух Народаў у Рэч Паспалітую Польскую. Гэты ціск спалучаўся з агрэсіўнымі памкненнямі Масковіі, якая крыху ачуняўшы пасля татарскага прыгнёту, скіравала прагны погляд на Захад, на нашу Айчыну — Вялікае княства Літоўскае. Леў Сапега разумеў, наколькі для Вялікага княства небяспечная аднавектарная палітыка — што саюз з Захадам супраць Масковіі, што з Масковіяй супраць Захаду. У тым і другім выпадках Літва (Беларусь) ператварылася б у закладніка чужых амбіцый. Ён усяляк імкнуўся захаваць хісткую раўнавагу ў Рэчы Паспалітай, прымусіць "Карону" паважаць суверэнітэт "Літвы", а таксама нейтралізаваць Масковію, пераканаць маскавітаў словам альбо сілаю, што з Літвою лепей сябраваць (і нават хаўруснічаць), чым ваяваць.

Леў Сапега прычыніўся да стварэння шэрагу дзяржаўных інстытуцый, якія рэальна мацавалі суверэнітэт Вялікага княства. Сапега разам з такімі ж незалежнікамі, як і ён сам, — Астафіям Валовічам і Крыштафам Радзівілам, стварае вышэйшы апеляцыйны суд — Трыбунал Вялікага княства Літоўскага. Ён узначальваў соймавую камісію па стварэнні Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года, фінансаваў выданне Статута ў віленскай друкарні Мамонічаў. Статут ВКЛ захаваў адасобленасць ад Польшчы дзяржаўных устаноў Вялікага княства, ягонага войска, эканомікі і фінансаў. У ім абвяшчалася ідэя верацярпімасці, сцвярджалася адказнасць усіх станаў грамадзтва перад законам, галоснасць судавытворчасці. Варта нагадаць, што надрукаваны Статут быў на дзяржаўнай мове Вялікага княства — беларускай.

Статут ВКЛ быў скіраваны ў будучыню, ён апярэдзіў свой час. У гэтым помніку беларускага права былі занатаваныя шэраг ідэй, якія астатні свет засвоіў толькі праз два стагоддзі, абмыўшыся крывёю Вялікай французскай рэвалюцыі. Статут быў настолькі дасканалым, што дзейнічаў на землях ВКЛ, нават калі Вялікага княства ўжо не існавала. Расійская ўлада спыніла ў нашым краі дзейнасць Статута і распаўсюдзіла на ліцвінаў (беларусаў) расійскае заканадаўства толькі ў 1840 годзе.

Леў Сапега мае дачыненне да Берасцейскай рэлігійнай уніі 1569 года. У гэтай справе ён браў удзел як каралеўскі пасол, паўнамоцны прадстаўнік вышэйшай улады. У Берасці адбылося тое, што і сёння падаецца цудам: каталіцызм і праваслаўе здолелі дамовіцца на глебе агульнахрысціянскіх каштоўнасцяў. Унія (каталіцызм усходняга абраду, грэка-каталіцызм) фактычна стала нацыянальнай рэлігіяй ліцвінаў (беларусаў), паставіўшы заслон духоўнай экспансіі на наш край як Польшчы, так і Масковіі.

Шмат зрабіў Сапега для Айчыны і як дыпламат і ваяр. Яго называлі "бацькам і збаўцам Айчыны". Ягоная смерць у 1633 годзе была для дзяржавы такой жа драмай, як калісь смерць князя Вітаўта. Кепскія часы надыходзілі для Вялікага княства Літоўскага, і не мела краіна асобы, здольнай змяніць ці хоць бы запаволіць хаду трагічных падзей. Не знайшлося сярод ліцвінаў другога Льва Сапегі...

7 ліпеня 1633 года Леў Іванавіч Сапега падняўся з-за сямейнага стала і, звярнуўшыся да сына Казіміра, сказаў: "Час ужо падыходзіць! Садзіся на месца маё, месца гаспадарскае". Сказаў і пайшоў у свой пакой. Пайшоў рыхтавацца да смерці. Тым жа днём ён сустрэўся з Богам... Пахаваны ў Вільні, у пабудаваным ім касцёле Святога Міхаіла.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

ЧУЛІ?

Адна дошка — добра, а дзве — лепей

У кожным мінскім класе будзе па дзве дошкі. Як паведамляе агенцтва "Мінск-Навіны", такі нарматыў прадугледжаны новымі санітарнымі правіламі для агульнаадукацыйных школ.

Плануецца, што падчас урока настаўнік будзе пераходзіць ад адной дошкі да другой, а вучні, паварочваючыся следам за настаўнікам, будуць здымаць статычныя нагрузкі, якія ўзнікаюць, калі доўга сядзець у адной позе.

Акрамя таго, ў класах з'явяцца афтальматрэнажоры: рознакаляровыя агеньчыкі будуць бегаць па перыметры кабінетаў, выпісваць васьмёркі, кругі і т.п. Назіранне за такімі агеньчыкамі памяншае нагрузку на вочы.

«Плошча. 19.03 — 25.03.2006»

Днямі ў офісе Партыі БНФ прайшла прэзентацыя кнігі "Плошча. 19.03 — 25.03.2006". Яна заснавана на перадачах Беларускай службы Радыё Свабода, што выйшлі ў эфір падчас падзей у Мінску пасля прэзідэнцкіх выбараў у сакавіку мінулага года.

"Плошча. 19.03 — 25.03.2006" — гэта хроніка масавых пратэстаў, калі ў адказ на аб'яўленыя вынікі выбараў у цэнтры Мінска паўстаў намётавы лагер, — гаворыцца ў тэксце на вокладцы выдання. — *Тысячы маладых і сталых грамадзян і гасцей Беларусі выказвалі нязгоду з палітыкай уладаў, надзеі на перамены і веру ў вяртанне краіны на дэмакратычны шлях. Многія з іх за свае погляды былі збітыя, выключаныя з універсітэтаў, звольненыя з працы, трапілі ў турму. Ніхто не адмовіўся ад свайго выбару".*

Як паведаміў на прэзентацыі дырэктар Беларускай службы Радыё Свабода Аляксандр Лукашук, у кнігу ўключана інфармацыя, якая гучала тады ў эфіры радыё і была апублікаваная на сайце. Гэта рэпартажы, інтэрв'ю, фотаздымкі. Паводле яго слоў, ад астатніх 11 кніг, выпушчаных Радыё Свабода, гэта адрозніваецца тым, што ў яе ўвайшлі таксама званкі слухачоў, якія паступалі ў рэдакцыю падчас масавых маніфестацый.

Таццяна ДАРАШЧОНАК, БелаПАН.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

«Галаброды» — гэта пра нас усіх...

"...Яны не ведалі, што гэта іх апошні вольны вечар. Што праз суткі-паўтары іх часам, здароўем, а то і жыццём будуць распараджацца іншыя. У гэту цёплую веснавую ноч яны ўсе — Сяргей Трушкевіч, Валодзя Родзік, Коля Горчак, Марыя Шчасная, Янка Шакурны — сабраліся разам... Ім, юным і гарачым у сваіх памкненнях, было пра што пагаварыць... Яны любілі жыццё, любілі гэты куточак, дзе нарадзіліся, і лічылі яго найлепшым і найдаражэйшым у свеце. Ім мроілася, што яны ў сілах нешта палепшыць у гэтым жыцці, што доля іхніх бацькоў і дзядоў іх ніяк не можа задаволіць. Іх наіву не было межаў. Ніхто з іх не ведаў, хоць, праўда, і апасаліся трохі, што над іх галовамі ўжо даўно быў занесены меч. Не, не той, які Горчак маляваў у руцэ вершніка на ўздыбленым кані, а больш страшны і пачварны меч здрады і нялюдскасці да таго, што яны лічылі святым..."

Гэта ўрывак з новага рамана вядомага празаіка Алеся Рыбака **"ГАЛАБРОДЫ"**, які ў пэўнай ступені з'яўляецца працягам рамана "Трэба было жыць", прысвечанага падзеям вайны і першым гадам пасля яе на тэрыторыі Беларусі. Час дзеяння ў "Галабродах" — канец саракавых у адным з заходніх куткоў Беларусі. Вайна скончылася, але жаданага міру не наступіла. Таталітарная сталінская сістэма працягвала ваяваць са сваім народам, як і ў жудасныя 30-я гады, усюды сеяла страх, насаджала даносы, вынішчала так званых "нацыяналістаў" — людзей, якія любілі сваю радзіму, сваю мову, гісторыю, хацелі дабра свайму народу. Асабліва бязлітаснае паляванне ішло на моладзь і тых, хто вучыў яе сваімі творамі, урокамі мужнасці і праўды, вяртаў гістарычную памяць, даваў прыклад працавітасці, любові і прыхільнасці да роднага куточка зямлі.

Алесь Рыбак, можна сказаць, упершыню ў нацыянальнай літаратуры асэнсоўвае новыя тэматычныя пласты, якія ў савецкія часы пісьменнікі нават закранаць не маглі. З першых старонак аўтар распавядае пра нябачную вайну дыктатарскай улады супраць шматпакутнай Беларусі, вайну, якая пачалася ў БССР у 1930-я гады, а для заходняй часткі Беларусі — адразу пасля сканчэння Другой сусветнай. Пачалася са злачыннай калектывізацыі, жудаснага лёсу перасяленцаў-беларусаў з Беласточчыны, арышту настаўнікаў, вучняў, якія хацелі ведаць праўду пра сваю радзіму. Кніга захапляе не толькі навізной праблематыкі, а і сваёй мастацка-вобразнай сістэмай, выклікае суперажыванне трагічным лёсам герояў, мужным учынкам патрыятычнай моладзі.

...Нездарма і раман, і аповесць **"Маша і Машка"** (якая раней цалкам была надрукавана ў "Народнай волі"), і апавяданні, што ўвайшлі ў кнігу "Галаброды", выклікалі зацікаўленне, добразычлівае абмеркаванне на нядаўняй прэзентацыі з боку нашых выдатных пісьменнікаў і чытачоў — прыхільнікаў беларускага мастацкага слова. У выступленнях і выказваннях **Вольгі Іпатавай** (яна вяла прэзентацыю), **Ніла Гілевіча, Генадзя Бураўкіна, Аляксея Рагулі, Эрнеста Ялугіна, Пятра Краўчанкі, Міколы Маляўкі, Уладзіміра Дамашэвіча, Міхася Міцкевіча** (сына Я.Коласа), іншых гучалі ўдзячнасць аўтару за глыбокі, праўдзівы раман.

"Галаброды", можна меркаваць ужо сёння, — кніга сапраўднай беларускай літаратуры, якая супрацьстаіць графаманскай макулатуры, "чтиву", што нічога не дае ні розуму, ні сэрцу. У рамане Алеся Рыбака "Галаброды" паўстае пасляваеннае мінулае, у аповесці "Маша і Машка" — дзень сённяшні: цяжкі час выжывання нацыі ў недэмакратычнай сістэме, выміранне вёскі, безабароннасць чалавека. Вынішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі ў 1930—1940-я гады — яскрава відаць ужо нават з аднаго раманнага фрагмента:

"...У кабінеце ў форме работнікаў органаў бяспекі сядзелі трое.

— Здравствуй, здравствуй, дорогой, — на ківок дырэктара неяк загадкава-злавесна адказаў адзін з іх, які, не зняўшы нават шапкі, па-гаспадарску ўсеўся за сталом, паклаўшы паверх пульхныя, нездарова белыя рукі. Двое іншых, таксама ў галаўных уборах, размясціліся на кушэтцы...

— Чым абавязаны важным гасцям? — Аляксей Мітрафанавіч, не знаходзячы сабе месца, тамтаўся пасярод пакоя, ліхаманкава прыкідваючы ў думках, як сябе паводзіць, што пытацца і што гаварыць. Страх, які на першым часе ледзь не паралізаваў яго, паціху пачаў праходзіць. З'явілася нават злосць. — Гэта маё рабочае месца, — ён падышоў да стала, як не на самыя рукі нязванага візіцёра кінуў класны журнал.

— Место тебе будет, не беспокойся, насидишься, — незразумела з якім намёкам выціснуў скрозь зубы старшы, але ўсё ж падняўся, даў сесці дырэктару. — Свили здесь гнездо разные антисоветские элементы, а директор прикидывается святошей, будто ничего не понимает, не видит и не слышит.

— Вы пра што?! — ажно пабялеў Аляксей Мітрафанавіч. — Тут нейкая памылка, недарэчнасць. У нас нармальная, здаровая школа, ніякіх элементаў, як вы кажаце, у нашым асяроддзі няма.

Старшы хмыкнуў:

— Это кто как смотрит... — ён раптам напружыўся, вочы сталі халодныя і калючыя. — Хватит болтовни. Позовите сюда Беляцкую, учительницу вашу. И побыстрее! А нет — так сами пойдем и выведем ее. Кстати, в котором классе она сеет свою отраву? В 8-м "А"?

— Якую атруту? Што вы гаворыце?! — Аляксей Мітрафанавіч кінуўся ў крэсла, хапіўся за сэрца. — Яна — лепшая ў раёне настаўніца беларускай літаратуры, гэтулькі вядзе, дзеці любяць яе. Яна сама піша вершы, сустракалася з многімі вядомымі пісьменнікамі... ставіць у школе спектаклі...

— Говно все это! — раптам гаркнуў бялёсы і, узмахам рукі падняўшы з кушэткі дваіх сваіх хаўруснікаў, загадаў: — Найдите ее и в машину! И чтобы не пикнул никто!.."

Перачытваючы такія старонкі, адчуваеш, наколькі дакладна ўдалося аўтару паказаць, як таталітарная сістэма і тады, і цяпер вынішчала і вынішчае векавыя асновы жыцця беларусаў, пазбаўляючы іх гістарычнай памяці, мовы, працоўных традыцый, выкараняючы злачыннымі метадамі пачуццё гаспадара на ўласнай зямлі.

Сёння мы зноў ходзім па замкнёным коле, зноў лютае хапун супраць усяго беларускага, зноў "инакомыслящих" прапускаюць праз дубінкі, допыты, турэмныя камеры, пасяленні. Супрацьстаянне, боль, але і аптымістычная вера ў тое, што будзе жыць народ, які столькі вынес пакут, ды не растварыўся ў шматвяковай русіфікацыі, не паддаўся на прапагандысцкія заклінанні розных служкаў рэжыму аб канчатковым "слиянии" — гэты моцны лейтматыў праходзіць праз раман і аповесць Алеся Рыбака, як і праз іншыя сапраўдныя творы сучаснай беларускай літаратуры. Назаву толькі некаторыя з іх: **"Здрапежаная зямля"** А.Петрашкевіча, **"Толькі мы самі"** Ніла Гілевіча, **"Алжырская пастка"** Эрнеста Ялугіна, **"Апошнія ахвяры свяшчэннага дуба"** Вольгі Іпатавай, **"Ксты"** Рыгора Барадуліна, **"Пакутны век"** Васіля Якавенкі, **"Красным по белому"** Веранікі Чаркасавай, выданне збору твораў Васіля Быкава (на жаль, у Маскве, а не ў Мінску...). Нягледзячы на розныя ганенні, адлучанасць беларускіх пісьменнікаў ад дзяржаўных выдавецтваў і сродкаў масавай інфармацыі, на забарону сустрэч з чытачамі, наша літаратура ўсё ж жыве, ствараючы высокамастацкі, высокадухоўны ахоўны покрыў над сваёй зямлёй і народам.

Лідзія САВІК.

РАРЫТЭТ

Інтэрнацыянальны арган

Яшчэ адну канцэртную пляцоўку атрымае ўжо сёлета сусветна вядомы Полацкі фестываль арганнай музыкі, які звычайна праходзіць у Сафійскім саборы. Неўзабаве частка ягонай праграмы зможа быць прадстаўлена ў Віцебску, у зале абласной філармоніі, дзе пачалася падрыхтоўка да ўсталявання аргана — *"караля музычных інструментаў".*

Віцебскі арган будзе сапраўды інтэрнацыянальным: у тэндэры на ягоны выраб перамагла славутая нямецкая фірма "Глатэр ГОТЦ", інструменты якой гучаць у розных краінах Еўропы, а таксама ў Маскве і Пярмі. Зборка элементаў аргана пачнецца ўжо ў маі, а затым у Віцебск прыедуць дасведчаныя настройшчыкі з Францыі.

Усю працу над арганам плануецца завяршыць да 1 чэрвеня 2007 года. Сродкі для набыцця адмысловага інструмента — 700 тысяч еўра — выдаткаваныя з абласнога бюджэту.

— *Ледзь даведаўшыся пра арган у Віцебску, заяўкі на месца штатнага арганіста абласной філармоніі даслалі музыканты з Мінска, Санкт-Пецярбурга і Масквы,* — распавёў начальнік упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама **Мікалай Пашынскі.** — *Так што выбар у нас вялікі. Але апроч пастаяннага арганіста на цудоўным інструменце будуць іграць і прыезджыя выканаўцы, у тым ліку — удзельнікі Полацкага міжнароднага фестывалю арганнай музыкі.*

Сяргей БУТКЕВІЧ.

В доме, где голод приходит через дверь, любовь уходит через окно.

(Латышская пословица)

З маладых спецыялістаў спагнана больш за 315 мільёнаў рублёў

Па ісках пракураў Брэсцкай вобласці ў 2006 годзе з маладых спецыялістаў, якія не адпрацавалі вызначаны тэрмін, спагнана больш за 315 млн рублёў. У тым ліку: з 23 выпускнікоў устаноў адукацыі МУС — больш за 179 млн рублёў; з 60 асоб, якія вучыліся за кошт сродкаў цэнтраў занятасці, — 63,6 млн рублёў; з васьмі выпускнікоў іншых навучальных устаноў — 72,6 млн рублёў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.

Сдается

На сутки однокомнатная квартира.
Тел. 8-029-709-48-82.

ЛЁСЫ ЛЮДСКІЯ

Волька-Сарагоўка

Хата яе з двума вялікімі вокнамі на вуліцу і высокім клёнам ля плота стаяла на самай макаўцы пагорка, які калісьці абжылі першыя пасяленцы вёскі. Наша хата была насупраць, праз вуліцу, на схіле таго ж пагорка, таму ў дождж вада з суседняга двара бурлівымі струменямі неслася ў наш двор і агарод. Гэта, між іншым, не шкодзіла сяброўству нашай маці з Сарагоўкай — так вяскоўцы ў размовах звалі Вольгу Аляксандраўну Кунцэвіч. Жыла яна з мужам Петрусём і двума дзецьмі. Чаму прыстала да яе тая мянушка? Ад назвы вёскі Сорагі, дзе жыла да замужжа. А пра мужа яе гаварылі так: "Пятрусь Сарагоўчын".

У маёй падлеткавай памяці аб гэтай добразычлівай, далёкай ад розных плётак-перасудаў жанчыне і па сённяшні дзень захаваліся светлыя ўспаміны. Яна была богабаязнай, усім зычыла дабра, да ўсіх ставілася з павагай. Калі выпадала, што ў нашай маці пад весну не заставалася і жмені мукі з мізэрнага калгаснага заробку (а ў хаце за сталом збіралася шасцёра дзяцей-малалетак), яна ішла да Сарагоўкі і вярталася з торбачкай жытняй мукі, змолатай у жорнах.

У час вайны, пад акупацыяй, калі ў вяскоўцаў не было ні газет, ні клуба, дарослыя і моладзь часцяком збіраліся ў хаце Сарагоўкі, бо ведалі, што не адмовіць, хоць муж Пятрусь быў чалавек не лёгкага нораву, мог кінуць гаманлівым вечароўцам калючую рэпліку. Бо мужыкі гулялі ў карты, смалілі цыгаркі з тытуню-самасейкі, і з-за дыму агонь у лямпе пад столлю пачынаў міргацець. Жанчыны не звярталі на буркатлівасць гаспадара асаблівай увагі, бо прыходзілі на вячоркі з прасніцамі і працавалі, абсеўшы доўгую шырокую лаву ад мыцельніка да покуці з абразамі. Нярэдка гаспадыня прыносіла з сенцаў торбу сушаных гарбузікаў і высыпала на стол: частуйцеся, госцікі!

З вясны 1943-га вячоркі ўжо не ладзіліся, бо з першымі прыцемкамі на вуліцы з'яўляліся партызаны, пачыналі па хатах ператрус — пошук адзення, абутку, самагонкі. У той год, у снежні, і завітала ў хату Сарагоўкі першая бяда. Аднойчы партызаны з засады за аселіцай забілі двух верхавых немцаў. Коні ацалелі і вярнуліся ў гарнізон, які атабарыўся ў вёсцы Вясея, наўзбоч шашы-"варшаўкі". Наступным днём адтуль у нашу вёсачку з'явіліся з дзесяткі тры немцаў. Яны пайшлі па хатах у пошуку вінаватых. Адчуваючы небяспеку, мужчыны і дзеці паспелі схавацца ў бліжэйшым лесе. Пэўна ж, гітлераўцы мелі намер узяць закладнікаў і расстраляць — такое яны рабілі не раз у партызанскіх вёсках. І тут ім пад руку выйшаў на вуліцу Пятрусь, муж Сарагоўкі. Афіцэр паклікаў яго і загадаў весці салдат да таго месца, дзе партызаны забілі іх саслужыўцаў. Там яго і застрэлілі, труп аблілі бензінам і падпалілі. Пасля таго як нябожчыка пахавалі, мужчыны яшчэ дзве ночы не прыходзілі днём у вёску, баючыся новай расправы.

Другое гора ў хату суседкі завітала ў жніўні 1944 года, калі паштарка прынесла пахавальную на сына Мікалая: дзевятнаццацігадовы юнак загінуў у танкавым дэсанце на Вісленскім плацдарме пад Варшавай. Засталася жанчына з семнаццацігадовай дачкой Зінай. Удваіх яны хадзілі ў калгас за амаль пустыя працадні, жылі з агарода і саду, як і большасць вяскоўцаў.

Трэцяя бяда напаткала Сарагоўку і яе дачку летам 1946 года, калі ноччу ад маланкі загарэлася іх хата пад саламянай страхой. Ледзь паспелі жанчыны вынесці сёе-тое з нажыткаў: усчаўся вецер, агонь хутка ахапіў сцены, перакінуўся на суседнюю хату. Вяскоўцы гуртам усё ж спынілі далейшы націск пажару. Сарагоўчына ж хата згарэла дашчэнту...

Вяскоўцы дапамаглі няшчаснай жанчыне пабудаваць новую. Наша маці перадала ёй сувой выбеленага палатна, некалькі збаноў і гаршкоў. Сарагоўка крыху акрыяла, жыла спадзяваннем, што выдасць дачку замуж і ўнукаў дачакаецца, а тыя дагледзяць яе на старасці год. Ды дачка Зіна неспадзявана памерла: надта многа невыносных перажыванняў з-за цяжкіх страт абрынулася на кволыя дзявочыя плечы.

Да Сарагоўкі перайшлі жыць пляменніца з мужам, участковым міліцыянерам. Гаспадыня была рада кватарантам, людзям сціплым і памяркоўным. Нарэшце, і сама яна прытулілася да надзейнай апоры. Яе другі муж з суседняй вёскі Загароддзе, да якога перайшла жыць, быў хоць і інвалід вайны, але добры гаспадар і наогул харошы чалавек. Яны пражылі разам душа ў душу гадоў дваццаць, калі не болей. Пасля смерці мужа гаротніца зноў засталася адна. Не схацела жыць у пустой хаце, вярнулася ў родную вёску Боркі, у свой дом на пагорку. Яе, на шчасце, прынялі як сваю, балазе цётка яшчэ магла дапамагчы пляменніцы і ў агародзе, і па доме.

Дажыла яна да дзевяноста аднаго года, захаваўшы да апошняга дня ясны розум і ўчэпістую памяць на ўсё перажытае за доўгія гады. Мо таму, што моцную характарам і добрую душой жанчыну пакуты не зламалі, не спустошылі, Бог паслаў Вольцы-Сарагоўцы лёгкую смерць — яна адышла ціха, у сне...

Лёс простай вясковай кабеты — толькі кропелька народнага лёсу з яго векавымі бедамі і скупымі радасцямі, з роспачнай трывогай і нязводнай надзеяй на лепшае.

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 18.04.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №